КАМПЕТЭНТНА
КАМЕНТАРЫЙ ДА ДАКЛАДА ПРААН АБ ЧАЛАВЕЧЫМ РАЗВІЦЦІ 2 стар.

ПАМЯЦЬ І ПРЫМІРЭННЕ
ПРАЦЯГВАЮЦЦА ВЫПЛАТЫ ВЯЗНЯМ ФАШЫЗМУ 3 стар.

ЗДАРЭННІ. СПОРТ. НАВІНЫ. 2–3 стар.

СПАДЧЫНА
"МАТУЛІН РУЧНІК" 5 стар.

ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ
«ПАД НЕБАМ КОЛАСА» 4 стар.

ФЕСТЫВАЛІ
БЕЛАРУСКАЯ «МЕДЭЯ» — ЛЕПШАЯ 4 стар.

ГАСЦЁЎНЯ
Юрый ВЫДРОНАК І ГУРТ "UR'IA" 8 стар.

КРЫЖАСЛОЎ 8 стар.

СТАСУНКІ
НАТАТКІ Яўгена АЕЦКІ З НАГОДЫ 70-годдзя польскага навукоўца Базыля БЕЛАКАЗОВІЧА 6 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі

Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

21 жніўня 2002 года, № 34 (2800) Цана 142 рублі E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

БЕЛАРУСЬ – АЛМАЗНАЯ ДЗЯРЖАВА?

У расійскім аналітычным інфармацыйна-даведачным выданні "Ювелір-інфарм", якое апублікавала нядаўна звесткі аб сусветнай вытворчасці сінтэтычных алмазаў, Беларусь упершыню названа ў ліку шасці сусветных лідэраў па выпуску гэтай прадукцыі. Цяпер рэспубліка толькі нязначна ўступае па аб'ёмах вытворчасці гэтай прадукцыі ЗША, Расіі, Японіі, Ірландыі і Швецыі.

Вызначальную ролю ў станаўленні ў Беларусі новых высокатэхналагічных вытворчасцей адыграла рэспубліканская навукова-тэхнічная праграма "Алмазы, звышцвёрдыя матэрыялы і вырабы на іх аснове", распрацаваная ў Нацыянальнай акадэміі навук. У сваю чаргу, флагманам новай алмазнай падгаліны ў беларускай індустрыі стала Гомельскае алмазаапрацоўчае вытворчае аб'яднанне "Крышталь". Менавіта яно на працягу некалькіх апошніх гадоў стварыла для нашай рэспублікі вытворчасць па сінтэзу алмазных мікра- і шліфапарашкоў і вырабу інструменту на іх аснове.

АХОЎНІЦА БАРТАЛАМЕЕЎКІ

Жыхарка сумна вядомай сваёй радыяцыйнай забруджанасцю вёскі Барталамееўкі Веткаўскага раёна Алена МУЗЫЧЭНКА (на здымку) захавала вернасць родным мясцінам.

За постчарнобыльскія гады ёй не раз прапаноўвалася перасяліцца ў "чысты" раён. Але яна адмаўлялася, знаходзячыся практычна на аўтаномным пражыванні. А ўсё, на што яна скардзіцца, дык гэта недахоп зносін: суседзі ж параз'язджаліся.

ВУП ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

Па выніках работы народнай гаспадаркі Беларусі сёлета ў студзені-ліпені ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года валавы ўнутраны прадукт у супастаўных цэнах значна вырас і склаў 105,7 працэнта.

За 7 месяцаў узраслі таксама і аб'ёмы вытворчасці прамысловай прадукцыі. Яе выпушчана на 11 трыльёнаў 210,3 мільярда рублёў, што на 3,2 працэнта больш, чым за студзень–ліпень мінулага года. Як паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу, гэты перыяд характарызуецца таксама павелічэннем аб'ёмаў вытворчасці харчовых і нехарчовых тавараў, алкагольных напіткаў.

СВЯТА НА РАДЗІМЕ ЯКУБА КОЛАСА

Рэспубліканскае свята ў гонар 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа пройдзе 7 верасня на яго радзіме ў Стаўбцоўскім раёне каля вёскі Мікалаеўшчына. Ва ўрачыстасцях прымуць удзел прадстаўнікі афіцыйных структур, творчай інтэлігенцыі, прафесіянальныя і самадзейныя артысты і калектывы.

А перад тым як пачнецца гэта вялікае свята на беразе Нёмана, яго госці наведаюць памятныя мясціны, звязаныя з дзяцінствам і юнацтвам вялікага песняра — Акінчыцы, хутары Ласток, Альбуць, Смольня. Тут таксама адбудуцца розныя мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею Якуба Коласа.

ЧАРОЎНЫ МІНСК

Упершыню ў сучаснай гісторыі беларускай сталіцы ў час правядзення 14 і 15 верасня свята горада "Чароўны Мінск" поўнасцю або часткова ў цэнтры будуць пешаходнымі адразу 14 вуліц і праспектаў.

Як расказаў начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віктар Кураш, сёння многія службы горада актыўна займаюцца падрыхтоўкай свята ў гонар 935-годдзя сталіцы. На вуліцах Мінска, якія стануць на некалькі дзён пешаходнай зонай, разгорнецца сапраўднае дзейства. Змяняючы адзін аднаго, будуць праходзіць тэатралізаваныя паказы, спартыўныя спаборніцтвы, кірмашы, святы піва і марожанага, канцэртныя праграмы, выставы, парад паветраных шароў, дыскатэкі.

Сталічныя ўлады даручылі мастакам распрацаваць эмблему свята. На працягу бліжэйшага месяца пройдуць конкурсы на лепшыя двор і вуліцу. Плануецца выпусціць тавары народнага спажывання з юбілейнай сімволікай, прысвечанай 935-годдзю горада. Для гледачоў і ўдзельнікаў свята будуць выраблены флажкі, кардонныя шапачкі, бейсболкі і панамкі з эмблемай свята. Да гэтай даты сталічнае тэлебачанне і газета "Минский курьер" рыхтуюцца правесці спецыяльныя конкурсы і віктарыны па гісторыі Мінска.

Падрыхтавала Ларыса ЛАЗАР.

актуальна

Фота БелТА.

РЭСТАЎРАЦЫЯ НЯСВІЖСКАГА ПАЛАЦА — ПАД КАНТРОЛЕМ

У Нясвіжы Мінскай вобласці адбылася вызная нарада па пытанні рэстаўрацыі «Палацава-паркавага ансамбля XVI-XVIII стагоддзяў у Нясвіжы».

У рабоце нарады прынялі ўдзел старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Анатоль Тозік, намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Дражын, міністр культуры Леанід Гуляка.

НА ЗДЫМКАХ: удзельнікі вызной нарады ў час агляду «Палацава-паркавага ансамбля XVI-XVIII стагоддзяў у Нясвіжы»; палац Радзівілаў – галоўны фрагмент палацава-паркавага ансамбля.

напярэдадні

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЫХТУЕЦЦА АДЗНАЧЫЦЬ 80-ГОДДЗЕ

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 15 верасня дзень нараджэння. Галоўнаму кнігасховішчу краіны споўніцца 80 гадоў.

Гэтай даце будзе прысвечаны шэраг навуковых і ўрачыстых мерапрыемстваў, якія пройдуць 16 і 17 верасня. Бібліятэка чакае шмат гасцей. Яны прымуць удзел у трэцяй нарадзе дырэктараў нацыянальных бібліятэк краін СНД, абмяркуюць магчымасці інфармацыйнага ўзаемадзеяння і падпішуць шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве. Рыхтуецца таксама ўрачысты вечар, прысвечаны юбілею. На яго прыбудуць прадстаўнікі бібліятэк не толькі дзяржаў Садружнасці, але і Літвы, Латвіі, Польшчы, Германіі, Францыі.

У праграме юбілейных мерапрыемстваў запланавана таксама пасяджэнне міжнароднага "круглага стала" на тэму "Нацыянальная бібліятэка — сімвал нацыі і дзяржавы". Дарэчы, святкаваць знамянальную дату збіраюцца работнікі ўсёй сферы, таму што менавіта 15 верасня ўпершыню ў нашай краіне ў гэтым годзе будзе адзначацца Дзень бібліятэк.

НА РАХУНКУ – ПЕРШЫ МІЛЬЁН

На спецыяльны рахунак, адкрыты для збору дабрачынных ахвяраванняў на будаўніцтва новага унікальнага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, ужо паступіла 1 мільён 311 тысяч рублёў.

Аб гэтым паведаміла журналістам дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Галіна Алейнік. Паводле яе слоў, самы буйны ўзнос на рахунак паступіў ад Беларускага універсітэта культуры.

Як паведаміў намеснік міністра культуры Валерый Гедройц, да работы па збору сродкаў на будаўніцтва новага будынка бібліятэкі далучылася і Міністэрства замежных спраў нашай краіны. Праз беларускія пасольствы за мяжой улады звярнуліся да нашай дыяспары з просьбай аказаць дапамогу ў будаўніцтве. Дарэчы, мяркуемы кошт узвядзення новага будынка галоўнай бібліятэкі краіны — каля 100 мільёнаў долараў.

Разліковы рахунак для дабрачынных ахвяраванняў: 3625000000038, філіял № 525 АСБ "Беларусбанк", код 122, УНН 100377889.

БелТА.

ВІЛЕНСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ ЗАПРАШАЕ

Кафедра беларускай філалогіі факультэта славістыкі Віленскага педагагічнага універсітэта (Літва) абвяшчае набор абітурыентаў па спецыяльнасці беларуская філалогія з магчымасцю атрымання дадатковай спецыяльнасці: журналістыка, культуралогія, маркетынг антыкварнай справы, геапалітыка. У Беларусі дыплом універсітэта мае юрыдычную сілу. Навучанне завочнае, платнае.

Структура навучання ва універсітэце мае тры ступені: бакалаўр, магістр, дактарант. У час вучобы замежныя студэнты змогуць атрымаць бясплатныя шматразовыя візы, папрацаваць у багатых архівах і бібліятэках Літвы, пазнаёміцца з мовай і культурай народа-суседа, прыняць удзел у культурным жыцці беларускай дыяспары.

Сёння на беларускім аддзяленні навучаецца каля 100 чалавек, сярод якіх, апрача грамадзян Літоўскай Рэспублікі, ёсць грамадзяне Беларусі, Англіі і Іспаніі.

Прыём дакументаў для замежных грамадзян да 15.09.2002 года, для грамадзян Літвы — да 15.10.2002 года.

E-mail:belfil@vpu.lt http://www.kraj.org/belfil Тел./факс (8-10-370-2) 75 16 04, 75 03 60

ПАДПІСКА-2002

Шаноўныя чытачы «Голасу Радзімы», каб наша сувязь не спынілася, раім паклапаціцца аб падпісцы. Нагадваем, што «ГР» уключаны ў падпісныя каталогі Беларусі, Літвы, Украіны, Казахстана, Таджыкістана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі.

У іншых краінах лепш аплаціць атрыманне штотыднёвіка чэкам, даслаўшы яго ў рэдакцыю. Кошт гадавога камплекта для краін Еўропы — 50, астатніх — 60 долараў ЗША.

БУДЗЕМ РАЗАМ!

армія



ВУЧЭННІ НА ПАЛІГОНЕ "АШУЛУК"

Міністр абароны Беларусі Леанід Мальцаў наведаў расійскі палігон Ашулук у Астраханскай вобласці Расіі, дзе правялі вучэнні Беларускія сілы ВПС і войск СПА.

Да вучэння былі прыцягнуты экіпажы знішчальнай авіяцыі і разлікі зенітных ракетных комплексаў "Бук". Яны стралялі па паветраных мішэнях "Стрыж-3" (аналаг крылатых ракет). Акрамя таго, беларускія вайскоўцы адпрацоўвалі пытанні вядзення баявых дзеянняў ва ўмовах радыёэлектроннага падаўлення.

Фота БелТА.

Стральба на палігоне «Ашулук» — адзін з этапаў вучэнняў войск Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ВПС і войск СПА Рэспублікі Беларусь, які пачаўся 23 ліпеня. У ходзе яго войскі, у прыватнасці, адпрацоўваюць пытанні адбіцця масіраваных ракетна-авіяцыйных удараў умоўнага праціўніка.

НА ЗДЫМКАХ: ракета накіравана ў цэль; за вучэннямі назірае міністр абароны Рэспублікі Беларусь Леанід МАЛЬЦАЎ.

здарэнні

ЗАТРЫМАНЫ НЕЛЕГАЛЫ

На трасе Масква – Брэст каля вёскі Запруды супрацоўнікі Кобрынскага райаддзела міліцыі спынілі для праверкі аўтобус "Мерседэс".

У ім аказаліся 11 жыхароў Афганістана, якія, як высветлілася, мелі намер нелегальна перасячы дзяржаўную мяжу, каб праз Польшчу трапіць у краіны Заходняй Еўропы. Пасля неабходнай у такіх выпадках праверкі няпрошаныя "госці" былі дэпартаваны за межы рэспублікі.

ЗНОЎ ФАЛЬШЫВАМАНЕТЧЫКІ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага раёна Брэста затрымалі двух грамадзян з расійскага Дагестана і яшчэ брата аднаго з затрыманых, які мае брэсцкую прапіску. Яны падазраюцца ва ўвозе і распаўсюджванні буйной партыі фальшывых 100-доларавых купюр.

Як сцвярджае кіраўнік прэс-службы УУС аблвыканкама Віктар Васілеўскі, фальшыўкі гэтыя завозіліся з Махачкалы і маюць вельмі высокую ступень падробкі, якую можна вызначыць толькі з дапамогай спецыяльнай тэхнікі. У ходзе расследавання 11 такіх купюр былі канфіскаваны ў кватэры непрацуючага і раней судзімага брэстаўчаніна. Яшчэ 99 стодоларавых фальшывак знайшлі ў поліэтыленавым пакеце ў адным з кантэйнераў для смецця па вуліцы Прыгараднай абласнога цэнтра. Міліцыя не выключае, што такую "ліпу", якая амаль уся мае адзін нумар 1733, адно клішэ з лацінскімі літарамі D.I.P., ужо маглі набыць некаторыя даверлівыя брэстаўчане і жыхары іншых рэгіёнаў краіны. А па факту затрымання фальшываманетчыкаў цяпер праводзіцца расследаванне.

СЛЕДСТВА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Тэрмін папярэдняга следства па крымінальных справах, узбуджаных у сувязі са знікненнем Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, прадоўжаны да сярэдзіны кастрычніка 2002 года. Аб гэтым гаворыцца ў паведамленні прэс-цэнтра рэспубліканскай Пракуратуры. Як адзначаецца ў прэс-рэлізе, "месцазнаходжанне вышэйназваных асоб да гэтага часу не ўстаноўлена".

У сувязі са зваротамі грамадзян у Пракуратуру з просьбай паведаміць даныя аб выніках расследавання па фактах знікнення шэрага вядомых людзей, прэс-цэнтр рэспубліканскай Пракуратуры таксама лічыць неабходным заявіць, што крымінальная справа аб знікненні Дзмітрыя Завадскага выдзелена ў асобнае вядзенне.

Падрыхтаваў Канстанцін СЕЛЬСКІ.

незабыўнае

АЛЕЯ ПАМЯЦІ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

Урад Беларусі вырашыў выдзеліць 97 900 расійскіх рублёў на выраб і ўстаноўку ў Санкт-Пецярбургу памятнай пліты ў гонар беларусаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў баях за горад Ленінград.

Па архіўных даных, такіх значыцца больш за 5 тысяч чалавек.

Рашэнне аб адкрыцці на Піскароўскіх могілках Санкт-Пецярбурга "Алеі памяці" з мемарыяльных пліт ад усіх дзяржаў, чые грамадзяне загінулі пры абароне Ленінграда, прынята кіраўніцтвам горада на Няве і будзе прымеркавана да яго 300-годдзя.

Адкрыццё беларускай пліты павінна адбыцца ў верасні 2002 года.

Галіна ВІР.

кампетэнтна

Аляксандр СЫЧОЎ: "ДЭМАКРАТЫЯ – РУХ НАПЕРАД"

НАМЕСНІК МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР СЫЧОЎДАЎ КАМЕНТАРЫЙ ДА ДАКЛАДА ПРААН АБ ЧАЛАВЕЧЫМ РАЗВІЦЦІ.

Як вядома, 24 ліпеня Арганізацыя Аб'яднаных Нацый прадставіла даклад аб чалавечым развіцці за 2002 год. Характэрна, што ў гэтым годзе даклад разам з агульнымі пытаннямі чалавечага развіцця датычыць і ролі дэмакратыі ў забеспячэнні чалавечага развіцця. Значная частка даклада прысвечана аналізу ўзроўню дэмакратызацыі ў зменлівым свеце, дадзена ацэнка асобных тэндэнцый, накіраваных на дасягненне мэт Дэкларацыі Тысячагоддзя ў сферы развіцця і ліквідацыі беднасці.

У гэтай сувязі хачу адзначыць, што ўрад Беларусі традыцыйна разглядае даклад аб чалавечым развіцці як аўтарытэтную міжнародную публікацыю. Ён распрацоўваецца незалежнымі экспертамі пры падтрымцы Праграмы развіцця ААН і іншых устаноў сістэмы ААН і з'яўляецца значным індыкатарам вызначэння накірункаў супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў ААН. Разам з тым урад Беларусі надае асобую ўвагу забеспячэнню ўсебаковага аб'ектыўнага падыходу да выкладання і абагульнення аналітычнай інфармацыі ў данай публікацыі. Паказчыкі, пакладзеныя ў аснову індэкса чалавечага развіцця, вядомыя. Я толькі хачу сказаць, што менавіта індэкс чалавечага развіцця сведчыць аб тым, наколькі кожная краіна вызначылася ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, і пры аналізе дасягненняў краіны ў сферы чалавечага развіцця важна не толькі яе месца ў сусветным рэйтынгу, але і абсалютнае значэнне індэкса. У гэтай сувязі хачу звярнуць увагу на тое, што рост абсалютнага значэння індэкса чалавечага развіцця ў Беларусі ў 2002 годзе склаў 0,788, тады як у 2001 годзе гэты паказчык быў 0,782. Мы бачым рост абсалютнага значэння індэксаў чалавечага развіцця для Рэспублікі Беларусь.

Разам з тым (гэта адзначалася і на прэзентацыях, і ў публікацыях у шэрагу СМІ) наша краіна перамясцілася з 53-га месца на 56-е. Чым гэта выклікана? Перш за ўсё гэта абумоўлена тым, што пры складанні аналагічнай справаздачы ў 2001 годзе аўтары рабілі аналіз толькі па 162 краінах, у гэтым — па 173-х. (У мінулым годзе з даклада былі выключаны тыя краіны, па якіх адсутнічалі дакладныя статыстычныя даныя).

Якое ж становішча ў Беларусі? Так, мы сёння саступаем некаторым краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы па індэксу чалавечага развіцця, але разам з тым мы апярэджваем некаторыя краіны гэтага рэгіёна і адначасова з'яўляемся лідэрам сярод дзяржаў СНД: Расія мае 60-ю, а Украіна займае 80-ю пазіцыю.

Лідзіруючыя пазіцыі нашай краіны перш за ўсё звязаны з высокім паказчыкам унутранага валавога прадукту. Беларусь займае другое месца ў свеце па паказчыку роўнасці даходаў і спажывання.

Выбраную ў бягучым годзе тэму даклада аб чалавечым развіцці, а яна называецца "Паглыбленне дэмакратыі ў фрагментарным свеце", Рэспубліка Беларусь вызначае як вельмі актуальную і своечасовую. Беларусь зыходзіць з таго, што вызначэнне існуючай фрагментарнасці свету на аснове дасягненняў сацыяльнай справядлівасці, ліквідацыі беднасці, барацьбы з ВІЧ/СНІД, забеспячэння экалагічнай стабільнасці, рашэння іншых глабальных праблем праз удасканальванне інстытутаў дэмакратычнага кіравання на нацыянальным і глабальным узроўнях з'яўляецца істотным укладам у выкананне тых мэт і задач, якія былі сфармуляваны ў Дэкларацыі, прынятай на Асамблеі Тысячагоддзя.

Згодна з дакладам, Беларусь сёння мае досыць высокія паказчыкі палітычнай стабільнасці і правапарадку і нізкі ўзровень карупцыі, апярэджвае іншыя краіны СНД і па паказчыку палітычнай стабільнасці, верагоднасці дэстабілізацыі сітуацыі, узнікнення напружанасці на этнічнай глебе, грамадскіх беспарадкаў, сацыяльных канфліктаў. Гэта датычыць таксама і паказчыкаў правапарадку.

У той жа час незалежныя эксперты лічаць, што Беларусь крыху адстае па паказчыку ўзроўню развіцця дэмакратыі. У гэтай сувязі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь адзначае, што аўтарам даклада пры падрыхтоўцы данай главы не ўдалося ў поўнай меры правесці ўсебаковы аб'ектыўны аналіз сітуацыі ў сферы развіцця дэмакратычных інстытутаў не толькі ў Беларусі, але і ў некаторых іншых краінах. Часткова гэта можа быць растлумачана надзвычайнай складанасцю выбранай тэмы і адсутнасцю дакладных і універсальных крытэрыяў і ацэнак для вымярэння ступені развіцця дэмакратыі і дэмакратычнага кіравання ў свеце. Па крайняй меры, гэта першая спроба, якая робіцца Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і, адпаведна, на гэтым шляху ўзнікаюць пэўныя цяжкасці. На наш погляд, варта крытычна аднесціся да прадстаўленых індыкатараў ацэнкі ўзроўню развіцця дэмакратыі. Мы пераконаны, што пры ацэнцы ступені развіцця дэмакратыі ў кожнай канкрэтнай краіне варта прымаць да ўвагі дадатковыя фактары гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага і палітычнага плана.

Падводзячы вынік, хачу сказаць, што мы падзяляем тое палажэнне, якое аўтары даклада спецыяльна ўключылі ў гэты дакумент: "Дэмакратыя і чалавечае развіццё — гэта не столькі канчатковая мэта, колькі стратэгічны накірунак руху. Грамадствы могуць быць больш ці менш дэмакратычнымі гэтак жа, як людзі могуць мець больш ці менш свабоды выбару аптымальнага для сябе ладу жыцця, але ні адно грамадства не з'яўляецца поўнасцю дэмакратычным ці поўнасцю развітым. Галоўнае ў дэмакратыі — пастаянна рухацца наперад і не адкочвацца назад".

Мы зыходзім з таго, што згодна з дакладам рэйтынг Рэспублікі Беларусь сведчыць аб дасягнутым нашай краінай гэўным прагрэсе ў сферы чалавечага развіцця. Разам з тым ён адначасова ўказвае на тыя задачы, вырашыўшы якія, Беларусь не толькі захавае лідзіруючыя пазіцыі сярод дзяржаў СНД, але і зможа прэтэндаваць на больш высокі рэйтынг.

Падрыхтавала Галіна ВІДАНАВА.

з прэс-канферэнцыі

БУДАВАЦЬ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

Днямі беларускія будаўнікі адзначылі сваё прафесійнае свята. Напярэдадні гэтай падзеі міністр архітэктуры і будаўніцтва Генадзь КУРАЧКІН сустрэўся з айчыннымі і замежнымі журналістамі, каб расказаць аб справах у сваёй галіне. Мяркуючы па добрым настроі міністра, у першым паўгоддзі будаўнікі папрацавалі вельмі нядрэнна. Пра гэта гавораць і прыведзеныя ім лічбы.

Напрыклад, пры прагнозе ўводу ў эксплуатацыю 1 мільёна 200 тысяч квадратных метраў жылля яго было здадзена за першыя шэсць месяцаў года на 187 тысяч квадратных метраў больш, чым запланавана. І што вельмі важна: шмат навасёлаў у сельскай мясцовасці. Тут пабудавана амаль трэць усіх новых кватэр, якія з'явіліся ў краіне.

Ну а самае галоўнае, што паступова пачаў зніжацца сабекошт будаўніча-мантажных работ. Зрабіць жыллё больш танным і даступным для насельніцтва — менавіта такая задача стаіць перад беларускімі будаўнікамі. За паўгода жыллё, якое ўводзіцца як з дапамогай дзяржавы, так і за асабістыя сродкі грамадзян, патаннела ў сярэднім на 10,9 працэнта. А пераход гаспадаркі Беларусі на адзіныя чыгуначныя тарыфы з Расіяй дазволіць будаўнікам паменшыць свае транспартныя выдаткі на 15 працэнтаў, што таксама станоўча адаб'ецца на зніжэнні кошту жылля.

Дарэчы, як паведаміў Генадзь Курачкін, рэалізацыя шэрагу мер па зніжэнні сабекошту будаўніцтва жылля дапамагла, у сваю чаргу, кампенсаваць недахоп інвестыцый у гэтую сферу. Таму, нягледзячы на тое, што аб'ём інвестыцый паменшыўся на 11 працэнтаў, тэмпы ўзвядзення новых дамоў у гэтым годзе не знізіліся.

Яшчэ адзін станоўчы вынік працы галіны — рост экспарту. Як адзначыў міністр, прадпрыемствы вядуць актыўную работу па пошуку і пашырэнні рынкаў збыту сваёй прадукцыі. За студзень-чэрвень за межы краіны было накіравана прадукцыі на суму больш за 80 мільёнаў долараў ЗША. Прычым экспарт будаўнічых матэрыялаў у краіны далёкага замежжа ўзрос у 4 разы, у тым ліку труб асбеставых — у 2 разы, вапны — у 1,5 раза і г.д. А на расійскім рынку па-ранейшаму прыярытэтнымі застаюцца керамічная плітка, дахавыя матэрыялы, металаканструкцыі, санітарна-будаўнічая кераміка. Больш чым удвая ўзрос і аб'ём экспарту будаўнічых работ і паслуг, які склаў за шэсць месяцаў звыш 16 мільярдаў рублёў.

Па словах міністра, гэтыя поспехі абумоўлены вялікай папярэдняй работай па мадэрнізацыі і прадпрыемстваў і ўкараненні новых тэхналагічных ліній, якія дазваляюць цяпер беларусам выпускаць шэраг сучаснай прадукцыі, канкурэнтаздольнай на сусветным рынку. Ды і самі працаўнікі імкнуцца ісці ўровень з часам, пераймаюць эфектыўны вопыт сваіх замежных калег. Асабліва добрыя адносіны склаліся з немцамі. Кожныя паўгода беларускія спецыялісты выязджаюць у Германію, дзе на практыцы знаёмяцца з новымі тэхналогіямі. А зараз дасягнута дамоўленасць на вучобу будуць накіроўвацца не толькі інжынерна-тэхнічныя работнікі, але і рабочыя розных спецыяльнасцей. Як лічыць Генадзь Курачкін, беларусам ёсць чаму павучыцца за мяжой, тым больш, што па выніках такой вучобы кожны чалавек павінен вытрымаць сур'ёзны экзамен.

Але ў будаўнікоў на сённяшні дзень ёсць шмат нявырашаных праблем. Скажам, фінансавы стан прадпрыемстваў пакуль застаецца складаным, таму некаторыя з іх маюць запазычанасці па плацяжах у бюджэт і пазабюджэтныя фонды, несвоечасова выплачваюць заробкі сваім працаўнікам. Аднак гэта адбываецца не па віне саміх будаўнікоў. Справа ў тым, што з часам павялічваецца запазычанасць заказчыкаў будаўнічых аб'ектаў, якая на сённяшні дзень складае звыш 81 мільярда рублёў. Акрамя таго, вялікая работа праводзіцца і па рэарганізацыі стратных прадпрыемстваў. Раздзяржаўленне і прыватызацыя будуць праведзены ў гэтым годзе на 6 прадпрыемствах дзяржаўнай маёмасці.

І ўсё ж, нягледзячы на складанасці, на думку міністра, у будаўнікоў ёсць добры патэнцыял для далейшай эфектыўнай работы.

Ларыса ЛАЗАР

памяць і прымірэнне

ВЫПЛАТА КАМПЕНСАЦЫЙ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Год таму ў Беларусі адбылася падзея, якую з вялікім нецярпеннем чакалі дзесяткі тысяч людзей, якія пацярпелі ў час другой сусветнай вайны ад фашызму: у краіне пачаліся кампенсацыйныя выплаты былым вязням нацызму са сродкаў нямецкага фонду "Памяць, адказнасць і будучыня". Падвядзенню вынікаў першага этапу гэтай акцыі была прысвечана прэс-канферэнцыя, якая адбылася ў Нацыянальным прэс-цэнтры. У ёй прынялі ўдзел старшыня Беларускага рэспубліканскага фонду "Узаемадзеянне і прымірэнне" Валянцін ГЕРАСІМАЎ, старшыня праўлення Германскага фонду "Памяць, адказнасць і будучыня" Міхаэль ЯНСАН, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ФРГ у Беларусі Хельмут ФРЫК, старшыня Камітэта па архівах і справавытворчасці пры Савеце Міністраў Уладзімір АДАМУШКА і шэраг іншых адказных асоб.

Падводзячы вынікі агульнага супрацоўніцтва, доктар **Міхаэль Янсан** адзначыў: "Я вельмі задаволены вынікамі нашай сумеснай работы. Мы выплацілі 110 мільёнаў еўра беларускаму фонду, які накіраваў гэтыя сродкі былым вязням фашызму. Зараз выконваем праверку ўжо восьмага спіса пацярпеўшых. Акрамя гэтага, беларускі бок правёў адпаведныя выплаты больш чым 7 тысячам жыхароў Эстоніі, дзе гэты працэс завершаны, і ў шэрагу дзяржаў СНД. У цэлым жа кампенсацыі праз беларускі фонд ужо атрымалі 80 тысяч чалавек".

"Перш за ўсё — гэта давер'е. І менавіта на гэтым пачуцці будуюцца нашы адносіны. Мы атрымалі ад Германскага фонду "Памяць, адказнасць і будучыня" сапраўдны крэдыт даверу. Разам з нямецкімі партнёрамі мы зрабілі крок наперад да дасягнення пастаўленай мэты, — засведчыў, у сваю чаргу, **Валянцін Герасімаў**. — Трэба адзначыць, што весь гэты час мы адчувалі не толькі добразычлівасць нашых партнёраў, але і падтрымку беларускага Прэзідэнта, урада, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства працы і Камітэта па архівах і справавытворчасці. Мы бачым таксама добрую дапамогу і разуменне з боку пасольства ФРГ у Беларусі. А ўсе фінансавыя аперацыі праводзіліся непасрэдна "Беларусбанкам", супрацоўнікі якога шмат зрабілі, каб хутка і якасна абслужыць кліентаў, выязджалі да хворых і састарэлых. На пачатковым этапе кампенсацыі атрымалі каля 70 тысяч беларусаў, якія ўваходзілі ў першыя шэсць спісаў. А з 18 ліпеня грошы сталі пералічвацца по сёмаму спісу, куды ўваходзяць яшчэ 10 тысяч чалавек. Мы плануем, што да пачатку верасня сума выплачаных кампенсацый складзе 118 320 140 еўра, а да канца года — 130 мільёнаў. Акрамя гэтага, каля 23 тысяч нашых грамадзян бясплатна атрымалі нямецкія і беларускія медыцынскія прэпараты. Зараз нямецкі фонд выдзеліў для набыцця лекаў яшчэ 150 тысяч еўра".

Па стану на 31 студзеня 2001 года ў Беларускі рэспубліканскі фонд паступіла 141 047 заяў ад людзей, якія прэтэндуюць на выплаты нямецкага ўрада. На сённяшні дзень экспертная камісія фонду прыняла 90 286 станоўчых рашэнняў. Зараз рыхтуецца чарговы 9-ты спіс, і да канца года фонд плануе завяршыць першы этап выплат — кожны пацярпелы атрымае 65 працэнтаў ад вызначанай сумы. Практычна ўжо зараз цалкам праведзены неабходныя выплаты былым вязням, якія жывуць у Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

А з пачатку наступнага года пачнецца выплата кампенсацый праваперaемнікам, якіх у Беларусі налічваецца звыш 16 тысяч. Дарэчы, федэральным законам вызначаны механізм выплаты фінансавых сродкаў у выпадку смерці былога вязня яго нашчадкам. У якасці апошніх могуць выступаць муж ці жонка памершага, яго дзеці або ўнукі, а пры іх адсутнасці — іншыя родзічы. Але гэтыя выплаты пачнуцца з 1 студзеня, пасля таго як грошы атрымаюць усе ахвяры фашызму, якія засталіся ў жывых. А ў ходзе завяршальнага этапу, які пачнецца праз год, усім ім будзе праведзены канчатковы разлік, і яны атрымаюць астатнія 35 працэнтаў сродкаў.

Нягледзячы на тое, што тэрмін падачы заяў на выплату кампенсацый ужо прайшоў, работы ў адпаведных арганізацыях хапае, бо права на атрыманне грошай неабходна пацвердзіць дакументамі, дакладнай інфармацыяй і паказаннямі сведкаў. Пасля вайны прайшло шмат часу, і таму састарэлым людзям не так проста самім знайсці патрэбныя дакументы. Таму пошукам іх у Германіі і Беларусі займаюцца спецыяльныя ўстановы, у тым ліку Камітэт па архівах і справавытворчасці пры Савеце Міністраў. Як гаворыць яго старшыня **Уладзімір Адамушка**, толькі ў гэтым годзе былі знойдзены неабходныя дакументы для 4 тысяч чалавек. "Агульны тэндэм беларускага і нямецкага фондаў сведчыць, што сумесна мы робім вялікую справу па аказанні дапамогі былым вязням, якія жывуць у Беларусі", — гаворыць ён. Дарэчы, Уладзімір Іванавіч — член Апякунскага савета нямецкага фонду "Памяць, адказнасць і будучыня". Па яго словах, на пасяджэннях савета адбываецца шмат гарачых дыскусій па розных тэмах. Але якім бы складаным ні было пытанне, выбар заўсёды робіцца на карысць пацярпелага. Напрыклад, нямецкі бок пайшоў насустрач пажаданням беларусаў і дазволіў афармляць паказанні сведкаў у грамадскіх арганізацыях былых вязняў фашызму па месцы жыхарства, такіх, як напрыклад, Беларускае аб'яднанне былых усходніх рабочых, Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму, Беларускае аб'яднанне былых вязняў фашызму "Лёс" і іншых.

І для такога даверу ёсць падставы. У адрозненне ад аналагічных структур, існуючых у краінах блізкага замежжа, беларускі фонд "Узаемадзеянне і прымірэнне" мае даволі высокую рэпутацыю, з яго назвай не звязаны ніякія скандалы, якія нярэдка здараюцца ў нашых суседзяў. Як гаворыць доктар Янсен, нямецкаму боку невядомы ні адзін выпадак, калі б грошы не былі пералічаны па назначэнню.

Дарэчы, былыя вязні фашызму — звыш 870 тысяч чалавек — зараз жывуць у 70 краінах свету. На выплату ім кампенсацый нямецкім урадам у цэлым было накіравана звыш 1,6 мільярда еўра.

Ларыса ЛАЗАР.

навука – вытворчасці



ІЗАТОПНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ
ПАШЫРАЮЦЬ ДЫЯПАЗОН ДЗЕЙНАСЦІ

Паспяхова развіваецца гаспадарчая дзейнасць беларуска-расійскага прадпрыемства "Ізатопныя тэхналогіі": у 2001 годзе аб'ём выкананых работ склаў больш за паўмільёна долараў, сёлета чакаецца – 1-1,5 мільёна долараў.

Вытворчасць радыеактыўных матэрыялаў, выраб і абслугоўванне радыеізатопных установак — гэта адзін з асноўных відаў дзейнасці прадпрыемства, створанага інстытутам праблем энергетыкі НАН Беларусі і расійскім Навукова-даследчым інстытутам атамных рэактараў. Дзякуючы яго дзейнасці, атрымала штуршок развіццё новых высокіх тэхналогій у галіне радыяцыйнай тэхнікі, замяшчэнне крыніц іанізуючых выпраменьванняў, якія ўвозяцца ў краіну для патрэб аховы здароўя, прамысловасці і навукі.

НА ЗДЫМКУ: спецыялісты прадпрыемства працуюць на ўстаноўцы атрымання ізатопных матэрыялаў.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БелТА.

сітуацыя

БЕЛАРУСКАЕ ПАСОЛЬСТВА Ў ПРАЗЕ АПЫНУЛАСЯ Ў ЗОНЕ БЕДСТВА

У Празе небывалая паводка. У найбольш пацярпеўшай частцы горада апынулася і беларускае пасольства.

Як высветлілася, беларускую замежную ўстанову давялося эвакуіраваць. Часова пасольства размясцілася ў рэзідэнцыі пасла Беларусі ў Чэшскай Рэспубліцы.

ПРАВЯРАЕЦЦА НЕКАЛЬКІ ВЕРСІЯ

Быццам разбуральны смерч пранёсся ў ноч з 13 на 14 ліпеня па першай алеі Паўночных могілак Мінска.

Нейкімі вар'ятамі тут было разбурана каля трох дзесяткаў помнікаў, на палове якіх былі высечаны яўрэйскія імёны. Гэты акт вандалізму выклікаў глыбокае абурэнне ўсяго беларускага грамадства.

Карэспандэнт "Голасу Радзімы" звярнуўся да дазнавальніка аддзела дазнанняў Упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама Аляксандра Мытніка з просьбай расказаць аб ходзе следства.

"Па гэтым факце праваахоўнымі органамі ўзбуджана крымінальная справа ў адпаведнасці з артыкулам 347, ч.1 Крымінальнага кодэкса — аганьбаванне могілак, — расказвае Аляксандр Рыгоравіч. — Зараз праводзіцца комплекс аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў, правяраюцца асобы, якія могуць мець дачыненне да гэтага злачынства, апытваем сваякоў у якасці пацярпелых. Мы распрацоўваем некалькі версій, у тым ліку аб магчымым дачыненні да гэтай падзеі нефармальнай групоўкі з Мінска. Над гэтай справай працуе цэлая следчая брыгада, і мы спадзяёмся, што злачынцы хутка будуць знойдзены".

Дарэчы, аднаўленнем помнікаў зараз займаецца унітарнае прадпрыемства "Спецкамбінат КБА", якое звярнулася ў Міністэрства фінансаў з просьбай аказаць неабходную дапамогу сродкамі для правядзення гэтай работы.

Ларыса ЛАЗАР.

спорт

ХАКЕЙ. Завяршыўся розыгрыш Кубка Беларусі па хакеі. Пераможцам стаў мінскі "Керамін".

СТРАЛЬБА З ЛУКА. У юнацка-юніёрскім чэмпіянаце Еўропы па стральбе з лука ў чэшскім Німбургу Антон Прылепаў заваяваў для Беларусі першы ў гісторыі краіны залаты медаль. У фінале Антон перамог прадстаўніка зборнай Паўднёвай Карэі.

ВЕЛАСПОРТ. Пасля васьмі этапаў веласіпеднай шматдзённі "Вялікая пятля" (яе яшчэ называюць жаночы "Тур дэ Франс") лідэрства ў агульным заліку захапіла беларуска Зінаіда Стагурская, якая апярэджвае саперніц на адну мінуту і адну секунду.

ФУТБОЛ. Форвард зборнай Беларусі Віталь Кутузаў на год пакінуў італьянскі "Мілан". Днямі яго аддалі "ў арэнду" чэмпіёну Партугаліі — лісабонскаму "Спортынгу", з якім ужо падпісаны кантракт. Варта заўважыць, што партугальскі клуб зацікавіўся Кутузавым ужо даўно. Так што, будзем спадзявацца, Віталь атрымае неабходную іграваю практыку на даволі высокім узроўні.

Кастусь СЯЎРУК.

лёсы

"ДЗВЕ РУСІ, ДЗВЕ СЯСТРЫ..."

У пакоі светла, утульна. Я разглядваю карціны, якіх тут шмат, а з радыёпрыёмніка гучыць песня "Две Руси, две сестры, один путь, один Бог..."

Падхапіўшы гэтыя словы, думаю, што сапраўды так: лёс краін і лёс людзей — знітаваны. Мастак Фёдар Савельеў — ураджэнец Беларусі. У 1939 годзе ён скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча. Прайшоў дарогамі вайны ад Масквы да Берліна. Сустрэў сваё каханне і назаўсёды звязаў жыццё з курскім краем.

Галіна Савельева расказвала, што, пазнаёміўшыся з яго малюнкамі (у гады вайны яна працавала ў вайсковай часці бібліятэкарам), нібы ўбачыла самога чалавека. Вырашыла адразу: гэта мой лёс. Словы аказаліся прарочымі.

Прайшлі разам праз усю вайну. Нарадзілася дачка Мая. Так курская зямля стала другой радзімай для Фёдара Савельева. Тут ён браў сілы як мастак, знайшоў тэмы і сюжэты для сваіх карцін. На першы погляд пры знаёмстве з творчасцю Фёдара Савельева адчуваеш прастату і сціпласць, але ўглядаешся ў эцюд і бачыш, як тонка назіраў мастак за прыродай, і ўжо сам апынаешся ў палоне такой замілаванасці і чароўнасці.

Індустрыяльныя пейзажы — так можна назваць серыю работ Фёдара Савельева, якія прысвечаны новабудоўлям.

У серыі "Лаўсан" будуецца" ён, падобна журналісту, дакументальна фіксуе этапы будаўніцтва. Такое ж уражанне застаецца і ад горада Жалезногорска.

Багаты матэрыял для развагі дае пакалечаная і зраненая баямі курская зямля. Мастак піша маўклівыя, заросшыя травой акопы ("Жывы вянок", "Сляды вайны"). У апошнія гады жыцця мастак перанёс цяжкую хваробу. Ён не рухаўся, але пісаў, пісаў усё, што бачыў з акна дома: сваю ціхую вулачку, дзе буяе зеляніна, пышную пярыну снегу, куточак саду з дрэвамі і кветкамі, нацюрморты, дзе сочнасць і яркасць фарбаў увасабляюць вечную сілу жыцця.

Фёдар Савельеў назаўсёды застаўся на курскай зямлі, а сям'я яго пераехала на яго радзіму — Беларусь. Родныя збераглі і прывезлі яго карціны, каб праз іх ён мог сустрэцца з землякамі.

Зараз Галіна Міхайлаўна разам з дачкой ладзяць выставу мастака.

Галіна ДЗЯТКОЎСКАЯ.

да 120-годдзя з дня нараджэння якуба коласа

ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ "ПАД НЕБАМ КОЛАСА"

У СТОЎБЦАХ ПРАЙШОЎ ТЫДЗЕНЬ ДЗІЦЯЧАГА МАСТАЦТВА "ПАД НЕБАМ КОЛАСА"

Нагода для свята цудоўная. Але на Стаўбцоўшчыне не трэба чакаць юбілею, каб успомніць Я.Коласа, бо нагадвае пра яго вельмі многае. У "Новай зямлі" пісалася пра гэты край. Жыхары Стоўбцаў ганарацца сваім земляком, прысвячаюць яго памяці творы, выступленні.

На Стаўбцоўшчыне шмат людзей занята мастацкай творчасцю. Калі даведваешся, што тут 39 дамоў культуры, сельскіх клубаў, 36 бібліятэк, 206 гурткоў, калектываў мастацкай самадзейнасці, прыемна здзіўляешся. Наогул, у мастацкай самадзейнасці занята каля дзвюх з паловай тысяч чалавек (з іх — 1 237 дзяцей). Часам, пачуўшы пагардлівыя размовы пра самадзейнасць, думаеш: людзі проста не разумеюць, што яна тая самая саломінка, за якую можна ўхапіцца, каб схавацца ад суму і руціны паўсядзённага жыцця. Сапраўды, ці важна, што прыносіць чалавеку адчуванне самарэалізацыі — праца ў славутым калектыве ці ігра ў тэатры мясцовай школы мастацтваў?

Фестываль дзіцячага тэатра ў Стоўбцах меў назву "Казкі жыцця" і пачаўся спектаклем тэатра "Іскрынка" "Чарадзейныя суніцы" па п'есе Алеся Якімовіча. Узначальвае калектыў вельмі прыемная і паважаная ў Стоўбцах жанчына — Марыя Грэсь. Прадставіў яе нам з фотакарэспандэнтам Яўгенам Казюлем загадчык аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатоль Грэкаў, чалавек, поўны жадання зрабіць у сваёй сферы нешта значнае і здольны здзейсніць гэта. Неаднойчы ў час нашага наведвання Стоўбцаў людзі, што працуюць у галіне культуры, згадвалі яго добрым словам, з удзячнасцю кажучы пра садзейнічанне ў самых розных пачынаннях. Наогул, тут не баяцца гаварыць нешта добрае адзін пра аднаго.

Марыя Грэсь, якая больш за 20 гадоў адначасова ўзначальвала раённы Дом культуры і тэатр "Іскрынка", з задавальненнем расказвае пра сваіх вучняў. Цяпер яна займаецца толькі тэатрам у школе мастацтваў, у трупе якога 22 чалавекі. Дарэчы, усе пастаноўкі "Іскрынкі" — беларускамоўныя. Марыя Грэсь расказвае: "Я займаюся з дзецьмі толькі на беларускай мове, хоць, на жаль, у побыце пануе руская. Дзеці арганічна ўспрымаюць беларускамоўнасць тэатра. З задавальненнем спрабуюць сябе і ў масавых пастаноўках (з апошніх — "Калі лялькі не спяць" па п'есе Леды Мілевай) і ў жанры тэатра аднаго акцёра. Маленькі артыст бярэ, напрыклад, штосьці з прозы Я.Коласа, да якой мы часта звяртаемся ў выкладанні сцэнічнага маўлення, і іграе — з афармленнем, выкарыстаннем лялек. Атрымліваецца цудоўная карціна, напрыклад, да "Казак жыцця".

Тэатр для дзяцей — заўсёды момант радасці. У маім жыцці быў перыяд, калі я працавала ў школе-інтэрнаце, дзе "Іскрынка" была таксама са мной. Мяне ўразіла, якія абяздоленыя і адначасова таленавітыя дзеці там жылі. У іх жыцці тэатр меў вялікае значэнне. Ужо скончыўшы школу, дзеці тэлефануюць мне і ўспамінаюць тэатр.

Цяпер нялёгкі час. Нават мізэрная плата за заняткі ў школе мастацтваў (гэта 4 тысячы рублёў, у эквіваленце каля 2 долараў) для многіх з'яўляецца праблемай. Дзеці цягнуцца да тэатра. Бацькі ж, бывае, разважаюць так: гэта не заняткі музыкай, якія могуць дапамагчы ў набыцці прафесіі, значыць, і непатрэбныя.

Тым не менш 22 чалавекі іграе ў маёй "Іскрынцы" з задавальненнем. Канешне, бацькоўская плата не вырашае праблем з набыццём дэкарацый. Нешта бяру ў Доме культуры. Але асабліва ўдзячная доктару Мёрсу, які прывозіць у Стоўбцы гуманітарную дапамогу і таксама падтрымлівае наш калектыў. Дзякуючы яму, у нас ёсць магнітафон, вельмі патрэбны для працы, прыгожыя цацкі".

Дарэчы, у школе мастацтваў працуе яшчэ адзін тэатр — "Чарадзеі", дзе 13 дзяцей (мастацкі кіраўнік і рэжысёр Вольга Навіцкая). На здымку вы бачыце фрагмент са спектакля пра сучасных дзяўчынак і хлопчыкаў "Прыгоды капітана Сарві-Галава, ці Гісторыя з каханнем". У рэпертуары "Чарадзеяў" таксама — "Старая казка на новы лад".

Акрамя тэатральнага фестывалю, у Стоўбцах адбыўся марш-парад духавых аркестраў "Залатая труба", фестываль юных музыкантаў "Сымон-музыка".

Мы з задавальненнем з'ездзілі ў Акінчыцы, што пад Стоўбцамі. Там юныя мастакі ладзілі пленэр пад паэтычнай назвай "Дзе льецца Нёман срэбраводны". Дзяўчынкі і хлопчыкі старанна і натхнёна малявалі і хату, дзе нарадзіўся Я.Колас, і наваколле.

Яшчэ амаль цэлы дзень у Стоўбцах танцавалі "Бусляняткі". Так называўся фестываль-конкурс дзіцячага танца, на якім выступалі не толькі мясцовыя калектывы, але і дзеці з вёсак Стаўбцоўшчыны: "Вішанька" Вішнявецкага сельскага Дома культуры, "Гарошынка" Заямнаўскай школы, "Рамонак" Коласаўскай школы мастацтваў, "Купалінка" Старасвержанскага дома культуры, "Зараначка" Навасвержанскай школы.

Дзеці так стараліся паказаць сваё майстэрства і спадабацца публіцы! Журы ўзначальвала дырэктар харэаграфічнай школы горада Мінска Ірына Дарохіна. Канешне, былі вылучаны лепшыя — Гран-пры атрымаў узорны ансамбль танца "Лявоначкі". Але ўсе дзеці былі непасрэдныя і прыгожыя.

Нас жа асабліва ўразіла кіраўніца ансамбля "Шчабятушкі" Стаўбцоўскай школы мастацтваў. Ала Сушч, прыгожая маладая жанчына, так эмацыянальна назірала за выступленнямі свайго ансамбля, так шчыра імкнулася дапамагчы дзецям усмешкай, жэстам! Цікава, што Ала працуе ў школе мастацтваў амаль з моманту з'яўлення ў ёй 15 гадоў таму аддзялення харэаграфіі. Цяпер там займаецца 65 дзяцей. Ансамбль "Шчабятушкі" з'явіўся пазней — 9 гадоў таму. Ала Сушч мае яшчэ адно вялікае захапленне — спявае і з'яўляецца адміністратарам народнага вакальнага ансамбля "Берагіня". Такім чынам, танцы (харэаграфія — яе асноўная прафесія пасля заканчэння Мінскага каледжа мастацтваў) і спевы — значная частка яе жыцця. Першае і другое, па яе словах, — тое, што робіцца для душы. Тут амаль няма матэрыяльнай зацікаўленасці. Праца вымагае шмат часу, таму што дзяцей Ала вельмі любіць. "Берагіню" таксама.

Што да "Шчабятушак", то гонар кіраўніцы — 6 вучняў, якія заканчваюць навучальныя ўстановы і стануць у хуткім часе прафесійнымі харэографамі.

Вельмі ганарыцца Ала сваёй вучаніцай Кацяй Федаценка — выпускніцай харэаграфічнага каледжа. Калі яна прыязджала танцаваць для дзяцей, яны былі ў захапленні, бо ўбачылі сваю зямлячку ў сапраўдных пуантах, балетнай пачцы.

"Шчабятушкі" — адлюстраванне сённяшніх праблем у харэаграфічнай падрыхтоўцы дзяцей. Недахоп выкладчыкаў — першая з іх. На наступны сезон Ала Сушч застаецца адзіным выкладчыкам харэаграфіі ў школе. Па розных прычынах два іншыя звальняюцца. Такім чынам, з'явілася праблема з наборам класаў. А займаюцца тут сур'ёзна. У праграме харэаграфічнага аддзялення — гісторыка-бытавы, народна-сцэнічны танец, гісторыя харэаграфічнага мастацтва, абавязкова музычны інструмент і тэорыя музыкі.

Яшчэ праблема: не хапае хлопчыкаў. Калі і ў сталіцы ў танцавальных студыях іх няшмат, то ў правінцыі заманіць іх танцаваць цяжка наогул. Ёсць праблема з касцюмамі. Як жа з усім гэтым удаецца спраўляцца?

Ала Сушч расказвае : "Цяжка працаваць на чыстым энтузіязме. Харэаграфія — дарагі жанр мастацтва. Для кожнай пастаноўкі дзіця трэба апрануць. Сапраўды, касцюмы, абутак, асабліва прафесійныя танцавальныя чаравікі — дэфіцыт. У маіх дзяцей ёсць у чым танцаваць толькі дзякуючы бацькоўскаму камітэту. Існуе бацькоўскі фонд. Для сваіх дзяцей бацькі робяць вельмі многа. Толькі сёлета адрамантавалі клас і раздзявалку. Цікава, што брыгада, якая рабіла рамонт, наогул адмовілася ад грошай за сваю працу. Бацькі пашылі дзецям 2 камплекты касцюмаў.

Дзеці ўспрымаюць заняткі вельмі непасрэдна. Для іх гэта і магчымасць чалавечых зносін. У пачатку года мы абавязкова праводзім пасвячэнне ў танцоры. У канцы робім вялікі справаздачны канцэрт, салодкі стол для дзяцей.

Стоўбцы знаходзяцца недалёка ад сталіцы. Нашы дзеці не прапускаюць цікавыя тэатральныя пастаноўкі, канцэрты ў Мінску. Мы садзімся ў электрычку, бяром з сабой бацькоў і вялікім гуртам едзем у тэатр. Што ж да спонсарства, то ў Стоўбцах спадзявацца на чыю-небудзь матэрыяльную падтрымку вельмі цяжка. Канешне, было б цудоўна знайсці мецэната, які б дапамагаў нам ездзіць на конкурсы, фестывалі. Але пакуль рэальна можна разлічваць толькі на бацькоў, якія клапоцяцца пра сваіх дзяцей і зацікаўлены ў іх эстэтычным выхаванні. На фестывалі мы ездзім таксама з дапамогай транспарту бацькоў і сваёй ініцыятывы. Зараз збіраемся ў Маскоўскую вобласць, у горад Азёры. Не бываць на падобных мерапрыемствах — значыць, варыцца ва ўласным саку. Канешне, як выкладчык, я адчуваю задавальненне і ад працы, і ад поспехаў сваіх вучняў. Але калі лічыць, што ансамбль існуе для гледача, зразумелае жаданне дзяцей выступаць на розных сцэнах. Таму трэба шукаць нейкае выйсце і круціцца.

Да нас вельмі добра ставяцца ў Стоўбцах. Калі ўзнікаюць нейкія глабальныя пытанні, нам ніколі не адмаўляюць у аддзеле культуры. Але ж мы не адны. Ёсць шэраг мастацкіх калектываў, якія маюць свае праблемы».

Дзіцячае мастацтва можа арганічна развівацца, толькі знаходзячыся пад увагай дарослых. Калі тыя не перашкаджаюць дзецям самавыяўляцца, а далікатна падтрымліваюць іх, — адбываецца прыгожае свята, як у Стоўбцах. А яго прысвячэнне Якубу Коласу надае яму цеплыню і пэўную самабытнасць.

Алена СПАСЮК

НА ЗДЫМКАХ: Марыя ГРЭСЬ; выступае дзіцячы тэатр "Чарадзеі".

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

летні матыў

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

фестывалі

"МЕДЭЯ" ПРЫЗНАНА ЛЕПШАЙ

Міжнародны фестываль старажытнагрэчаскай драмы, які толькі што закончыўся на Кіпры і ў якім прымалі ўдзел прадстаўнікі вышэйшых тэатральных школ, стаў шчаслівым для студэнткі 4-га курса Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры Надзеі Алешачкінай.

Яна атрымала высокую ацэнку спецыялістаў за монаспектакль "Медэя", пастаўлены рэжысёрам-педагогам Антанінай Міхальцовай. Як расказала настаўніца маладой актрысы, якая з'яўляецца акрамя таго генеральным сакратаром Беларускага тэатра Міжнароднага інстытута тэатра ЮНЕСКА, у фестывалі прымалі ўдзел выхаванцы тэатральных ВНУ з васьмі краін, у тым ліку з ЗША, Вялікабрытаніі, Латвіі, Польшчы, Лівана, Кіпра. Беларусы ўдзельнічаюць у гэтым форуме штогод і заўсёды вяртаюцца дамоў з поспехам. А монаспектакль "Медэя" ў новым сезоне можна будзе ўбачыць у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі.

Вольга ШЧАДРЫНА, БелТА

спадчына

МАТУЛІН РУЧНІК

Беларускі ручнік шматзначны і кранальны, пра яго хочацца спяваць. Нездарма ж столькі вершаў і песень прысвечана ручніку. Нагадаю верш "Ручнікі" Аркадзя Нефрановіча:

Ручнік бялюткі для дзіцяці,
Каб чалавек хутчэй акрэп.
І вытканы рукамі маці —
Накрыць гарачы з печы хлеб.

На покуці у хаце — Бога
Ушанаваны светлы лік.
І адмысловы — у дарогу,
І для нябожчыка ручнік.

І ёсць на гадавое свята,
Калі у сэрцы весялосць.
З каймою — павязаць
каб свата,
І з пеўнікамі — калі госць.

Дажынкі — і у вёсцы гулі,
Там баль спраўляе хлебароб.
І ручніком, што ад бабулі,
Абвязаны апошні сноп.

І самы дарагі, адзіны,
Найпрыгажэйшы — на пасаг.
Каб быў шчаслівым
у дзяўчыны
І замужам жыццёвы шлях.

На іх ад розных бед замовы,
Ва ўсе часы для нас яны —
Як сімвал матчынай любові,
Як знак людское дабрыні.

Верш выклікае самыя глыбокія пачуцці... І гэта не выпадкова, бо ён працяг паэтычнай традыцыі. Аказваецца, шырока вядомую песню "Ручнікі", якую лічаць народнай, напісаў Мікалай Пятрэнка, настаўнік Аркадзя Нефрановіча.

Ручнік — гэта не толькі тое, чым выціраюцца, гэта штосьці больш значнае, традыцыйнае. Ён займае пачэснае месца ў беларускай культуры. Нацыянальныя адметнасці ткацтва і вышыўкі беларусаў выяўляюцца ў дэкоры адзення, у арнаментах ручнікоў, якія заўсёды былі неад'емным атрыбутам беларускага сялянскага жыцця. Яго асаблівасць (форма, памер, вышыўка, карункі) залежала ад майстэрства жанчыны-ткачыхі, жанчыны-майстрыхі.

Хлеб-соль на стале накрыты беласнежным ручніком — частка інтэр'ера беларускай хаты. Раней лічылася нядобрай прыкметай падаваць ежу на "голы" стол. На святы слалі абрусы, для аднаго госця — ручнік. Самы прыгожы ручнік — на покуці з абразамі.

У побыце беларусаў ручнікі выконвалі не толькі утылітарна-дэкаратыўныя функцыі, але спакон веку разнастайныя абрадавыя функцыі. Сэнс ручніка глыбока звязаны з культурай беларусаў, з беларускімі народнымі традыцыямі. У наш час маюць працяг многія абрадавыя функцыі ручніка, асабліва ў вясельных абрадах.

Хлебам-соллю на ручніку сустракаюць маладых. Ручнік выкарыстоўваюць у якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Ручніком абгортваюць рукі маладых, абводзяць вакол стала, заводзяць за стол. Заўсёды ручнік — каштоўны падарунак родзічам маладога, пераважна мужчынам. Ручнік — дзявочы сімвал, частка пасагу дзяўчыны, паказчык яе майстэрства, таленту, працавітасці.

Шырока ўжываецца ручнік у жалобнай абраднасці. На ручніках апускаюць у магілу труну. На Палессі ручніком абвязваюць магільныя крыжы. Рытуалы з ручніком вядомыя пры ўшанаванні продкаў.

Традыцыйная гама беларускіх ручнікоў стрыманая, пераважаюць белыя і бела-шэрыя тканіны, чаргаванне адбеленых і неадбеленых (суравых) нітак і папярочнай ніткі-ўток, што стварае серабрысты бела-шэры малюнак геаметрычнага характару. У ручніках пераважаюць геаметрычныя матывы, галоўным чынам, ромбы. Ромб — старажытная выява зямлі і ўрадлівасці. Адначасова гэта сімвал засеянага поля. А ромб з "кручкамі", "рагамі", "вёсламі" азначае вечнасць і рух. Гэтыя знакі — заклінанні аб ураджаі, удачы, здзяйсненні жаданняў. Меншыя ромбы называлі "хлябамі", што азначала ежу як для цела, так і для душы.

Сустракаюцца таксама раслінныя матывы, зааморфныя матывы сімвалічнага характару. Нават у нашы дні можна адшукаць старадаўні ручнік з сілуэтнымі малюнкамі жывёл і раслін. Старажытныя ромбы, крыжыкі і іншыя фігуры мелі свой пэўны сэнс і адлюстроўвалі светапогляд народа. У наш час першапачатковы сэнс узораў забыты. А раней, калі яшчэ не існавала пісьменства, праз узоры выказвалі розныя пажаданні і запаветы.

Усе вышыўкі на беларускіх ручніках выконваюцца ў асноўным чырвоным колерам на белым фоне, часам з дадаткам чорнага. Чырвоны колер са старажытных часоў лічыўся сімвалічным, як колер сонца, як знак сонца, а значыць, жыцця. Чорны дадавалі, каб напомніць, што жыццё не вечнае, ён сімвалізаваў зямлю. Зялёны — колер прыроды, колер росту, развіцця, дабрабыту, міру. Ну а белы — гэта колер свабоды, маральнай чысціні і мудрасці.

Чырвоны народны ўзор, інакш кажучы, арнамент, па сваім паходжанні — сімвалічны малюнак, графічны спосаб заклінання вышэйшых боскіх сіл. Дарэчы, на дзяржаўным сцягу адлюстраваны найбольш старажытны арнамент. Вышыўка належыць сялянцы Матроне Маркевіч.

Традыцыйныя віды вышыўкі — вышыўка наборам. Узор атрымліваецца з абодвух бакоў. Больш позняя з'ява — вышыўка крыжыкам, потым паліхромная вышыўка гладдзю.

Каб зразумець самабытную культуру беларусаў, трэба ў першую чаргу вывучаць гісторыю стварэння і выкарыстання ручніка.

Менавіта з такой мэтай сабраліся навучэнцы беларускай нядзельнай школы. Жаночыя пасядзелкі назвалі "Матулін ручнік". З бабуліных і матуліных куфэркаў, дзе зберагаецца тое, што павінна зберагацца і перадавацца ад бабуль да ўнукаў, дасталі ручнікі. Атрымалася цудоўная выстава беларускіх ручнікоў з розных куткоў Беларусі. Больш за ўсё было ручнікоў з Віцебшчыны. Была прадстаўлена Брэстчына і Гродзеншчына. І ўсе ручнікі пры некаторай агульнасці адрозніваліся адзін ад аднаго, асабліва брэсцкія. Тут адчуваецца ўплыў украінскага народнага мастацтва з яго больш яркай расфарбоўкай, вышыўкай гладдзю, паліхромнай (шматколернай) гладдзю, рознакаляровымі букетамі, незвычайнай прыгажосці карункамі. Гладзь з'явілася на Палессі яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя, паступова выпрацаваліся пэўныя мясцовыя адметнасці.

Гродзенскія ручнікі аздоблены бела-шэрым малюнкам па ўсім полі, з узорам з адбеленых нітак. На гродзенскіх ручніках дэкор абмятаўся адной-дзвюма вузкімі безузорнымі палоскамі. А на віцебскіх — старажытным двухбаковым швом і аздабляўся вышыўкай-наборам. На першы погляд, здавалася, што ручнік не вышыты, а вытканы: з адваротнага боку дакладнае адлюстраванне.

Быў тут і беларускі трапкач — ручнік з доўгімі махрамі. Ён не беласнежны і не арнаментаваны, не ўпрыгожаны карункамі, мае іншы знешні выгляд. Гэта той від ручніка, які заўсёды пад рукой як неад'емны атрыбут кухні. Значэнне трапкача больш практычнае, чым эстэтычнае. Такі ўкарочаны ручнік з махрамі служыў і для "выхавання" дзяцей-неслухаў. Другая назва такога ручніка — скарач, пры патрэбе можна было хуценька абцерці твар, рукі, стол, посуд.

Многа цікавага даведаліся прысутныя ад нашых настаўнікаў пра беларускі ручнік. Яшчэ зусім нядаўна ткаць і вышываць было галоўным абавязкам для кожнай дзяўчыны. Але з цягам часу светапогляд і само жыццё змяніліся. Аднак асабіста мне захацелася вышыць свой ручнік.

Вазьму я сонечны прамень
І вільгаць ад крыніц,
Паўдзённую спякоту
І звонкі шчэбет птушак,
Зары вячэрняй свет, яе красу,
На кветачцы дрыжачую расу,
Духмянае паветра лугу
і стагоў.
І не забуду прыгажосць садоў.
Складу ў ручнік я восені зары,
Подых зямлі, яе пары.
Ўкладу часцінку сэрца
я свайго...

На ЗДЫМКАХ: жаночыя пасядзелкі «Матулін ручнік»; беларуская хатка ў Даўгаўпілсе.

Алена БУЧЭЛЬ.

Даўгаўпілс, Латвія.

шматгалоссе

АДНОЎЛЕНА МУСУЛЬМАНСКАЯ СВЯТЫНЯ

Літаральна з руін паўстала мусульманская святыня – мячэць у вёсцы Каталошы Навагрудскага раёна, першы ўспамін пра якую ў архіўных дакументах адносіцца да 1420 года. Адноўлены храм на ахвяраванні мусульманскіх абшчын. Найбольшую дапамогу ў яго аднаўленні аказалі татары-землякі з Навагрудка і Іўя.

Вартая ўвагі "святая магіла", якая знаходзіцца побач з храмам. Па легендзе, некалі жыў у вёсцы святы пастух. У адну з начэй выкапалася для яго магіла, ён лёг у яе, і засыпала яго зверху пяском. Так і ўзнікла гэта "святая магіла".

Трэба адзначыць, што ў Каталошах на сённяшні дзень налічваецца ўсяго два татарскія двары, а раней вёска лічылася мусульманскай.

НА ЗДЫМКАХ: адноўленая мусульманская святыня; легендарная "святая магіла".

Тэкст і фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БелТА.

КАНЧЫНА НАЙСТАРЭЙШАГА КЛІРЫКА МІНСКАЙ ЕПАРХІІ

Цяжкую страту панесла Беларуская праваслаўная царква: 17 жніўня на восемдзесят сёмым годзе жыцця памёр найстарэйшы клірык Мінскай епархіі, настаяцель Свята-Аляксандра-Неўскай царквы на Мінскіх ваенных могілках протаіерэй Віктар Васільевіч Бекарэвіч.

Патомны свяшчэннік, айцец Віктар належаў да старажытнага беларускага роду духоўнага саслоўя, якое падарыла маці-царкве мноства служыцеляў прастола Гасподняга.

Будучы протаіерэй Віктар нарадзіўся 24 лістапада 1915 года ў Вялікіх Дольцах Мінскай губерні. Скончыўшы ў 1936 годзе поўны курс Віленскай духоўнай семінарыі, у тым жа годзе малады выпускнік быў пасвячоны ў горадзе Вільні Архіепіскапам Віленскім і Літоўскім Феадосіем у дыяканы, а затым у прасвітэры.

Падзеі 1939 года і другая сусветная вайна перашкодзілі маладому свяшчэнніку закончыць багаслоўскі факультэт пры Варшаўскім універсітэце, дзе ён вучыўся на працягу трох гадоў. З часу свайго пасвячэння па красавік 1959 года айцец Віктар быў настаяцелем цэркваў у Ілії і Латыглі Вілейскага раёна, а таксама ў раённым цэнтры Стоўбцы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны руплівы пастыр прадаўжаў сваё служэнне Богу і людзям на акупіраванай тэрыторыі, падтрымліваючы сувязі з партызанскім рухам. Ён вызначаўся мужным патрыятызмам ва ўмовах, якія пастаянна пагражалі яму, членам яго сям'і і пастве смяротнай небяспекай.

Пасля пераводу ў Мінск у красавіку 1959 года протаіерэй Віктар на працягу трыццаці чатырох апошніх гадоў да апошняга дня быў настаяцелем царквы ў гонар святога Вялікага князя Аляксандра Неўскага, размешчанай на гістарычных Ваенных могілках. Яго служэнне ў гэтым сталічным храме было спынена толькі на дзевяць гадоў, калі ў перыяд з мая 1970 па ліпень 1979 года протаіерэй Віктар узначальваў сабор у гонар Свяціцеля Мікалая ў сталіцы Аўстрыі Вене.

Плённай была адміністрацыйная дзейнасць протаіерэя Віктара ў Мінскай мітраполіі і ў гады замежнай камандзіроўкі. У розныя перыяды ён з'яўляўся благачынным Вілейскай і Стаўбцоўскай царкоўных округ, членам Епархіяльнага савета Мінскай епархіі, сакратаром Правячага архіерэя Мінскай кафедры, сакратаром Мінскага і Венскага епархіяльных упраўленняў.

Для ўсіх, хто хоць аднойчы меў радасць зносін з протаіерэем Віктарам, ён уяўляў сапраўднае выканне апостальскага запавета, які быў успрыняты ім як асабісты свяшчэнны абавязак без малога шэсцьдзесят шэсць гадоў таму, пры ўскладанні на яго нагруднага іерэйскага крыжа ў дзень пасвячэння: "Будзь узорам для верных у слове, у жыцці, у любові, у духу, у веры, у чысціні".

Свяшчэнная запаведзь Апостала выканана протаіерэем у поўнай меры.

зваротная сувязь

УКРАІНА, КРЫМ

Дарагая рэдакцыя! Мы, беларусы Крыма, чуем твой голас здалёку. Дзякуем, што ты ёсць! Я, Вольга Міхайлаўна Рудэнка, не магу не расказаць пра наша жыццё ў Крыме. Наша таварыства ўжо адзначыла маленькі юбілей – 10 гадоў. У розных куточках цудоўнага Крыма працуюць беларускія клубы, гурткі. Але вельмі хацелася б, каб нам дапамаглі з памяшканнем. Сорамна і крыўдна, што мы, беларусы, па колькасці на 4-м месцы ў Крыме, а памяшкання свайго не маем.

Я з'яўляюся членам праўлення таварыства "Белая Русь" у Крыме, узначальваю жаночую арганізацыю. Настаўніца. Цяпер дырэктар народнага музея М.Астроўскага, таму ў асноўным звязана з моладдзю. Пры Маладзёжненскім Доме культуры (гэта Сімферопальскі раён) стварыла клуб "Дружба", дзе шмат секцый, гурткоў. Праводзім сустрэчы як у сябе, так і ў "Рускім цэнтры" і іншых таварыствах Крыма. Пастаянна ў пошуку, руху.

Хачу расказаць пра маіх сяброў — сям'ю Тупікаў. Іван Ціханавіч (з Азарычаў Калінкавіцкага раёна) і Рамуальда Філарэтаўна (з Гродзенскай вобласці) — настаўнікі нашага раёна. Яны ветэраны вайны і працы. Кожны з іх адзначыў ужо па 75! А ў верасні будуць святкаваць залаты сямейны юбілей. Вельмі прашу змясціць іх фота ў газеце і павіншаваць з юбілеем. Няхай беларусы свету даведаюцца пра іх і парадуюцца разам з намі. Гэта энергічныя людзі з чулымі сэрцамі. А як яны спяваюць! У ансамблі горада Сімферопаля пры Кіеўскім сабесе яны прапагандуюць нашы беларускія песні, нашу культуру.

У музеі ў мяне ёсць куток славянскай культуры. Мы ўсюды афармляем выставы, даём канцэрты, запрашаем да сябе прадстаўнікоў іншых таварыстваў. Праводзім Дні славянскай культуры, адзначаем юбілеі беларускіх пісьменнікаў, паэтаў.

І яшчэ адна просьба. Вельмі мала мы атрымліваем газет. Прашу вас, калі магчыма, прысылайце газету для нашага клуба "Дружба". Пры ім ёсць дзіцячы фальклорны ансамбль "Калінка" (2–3 класы), а члены клуба — дарослыя рознага ўзросту.

Загадзя дзякую.

Вольга РУДЭНКА.

ЗНОЎ САБРАЛА СУРОДЗІЧАЎ ЛІДА

Сёмы па ліку сусветны з'езд лідчан адбыўся ў старажытным горадзе. На сваёй малой радзіме сабраліся суродзічы, якіх абставіны лёсу параскідалі па розных краінах свету, а таксама іх дзеці і ўнукі.

Разнастайнай і цікавай была сустрэча землякоў. Госці зацікаўлена гаварылі аб рэлігійным адраджэнні, з задавальненнем адзначаючы рост будаўніцтва каталіцкіх і праваслаўных крамаў. Такую ж зацікаўленасць выклікала тэма беларускага і польскага нацыянальнага адраджэння. З паведамленнямі пра гэта выступілі старшыня Таварыства польскай культуры Лідчыны Аляксандр Колышка і кіраўнік гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны Станіслаў Суднік. А добрай ілюстрацыяй да размовы паслужылі ўзнёслыя выступленні гуртоў і ансамбляў "Крэсавяцы", "Калі ласка", "Шалом", якія выканалі польскія, беларускія і яўрэйскія песні.

У час работы з'езда адбылося нямала хвалюючых сустрэч, так бы мовіць, па інтарэсах, вечароў-успамінаў. Пра многае згадалі колішнія аднакласнікі, суседзі, проста землякі. Яны перш-наперш гаварылі пра адвечную згоду і прыязнасць паміж народамі, якія насяляюць Бнларусь.

Удзельнікі з'езда пазнаёміліся з сённяшнім жыццём горада і раёна, выязджалі на экскурсіі ў іншыя мясціны. У прыватнасці, госці наведалі Вільню, здзейснілі паездкі па марштурах Ліда—Слонім—Ружаны—Косава—Жыровічы—возера Свіцязь і Ліда—Навагрудак—Мір—Нясвіж—возера Свіцязь.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ.

нататкі яўгена лецкі

АДДАНАСЦЬ СЛАВЯНСТВУ

З нагоды 70-годдзя Базыля БЕЛАКАЗОВІЧА

Навукоўцы, што займаюцца праблемамі культуры і літаратуры ўсходніх славян, іх узаемаўплывамі, шырока адзначылі 70-годдзе з дня нараджэння, што амаль супала з 50-годдзем творчай дзейнасці, аднаго з самых заслужаных і аўтарытэтных сваіх флагманаў Базыля Белаказовіча. На ўрачыстасцях прадстаўнікамі розных краін было сказана шмат прачулых слоў у адрас юбіляра, глыбока і ўсебакова прааналізавана зробленае ім за паўстагоддзя. Найбольш важкім вынікам з'явілася выданне інстытутам усходняй славяншчыны ў Ольштыне, дзе апошнім часам Базыль Белаказовіч працуе загадчыкам кафедры ў Вармінска-Мазурскім універсітэце, грунтоўнага тома навуковых прац.

Кніга налічвае 500 старонак, складаецца з васьмі раздзелаў, першы з якіх, уступны, і прысвечаны ўласна Белаказовічу. Зразумела, у іншых раздзелах яго імя час ад часу таксама згадваецца, але цэласнасць кнігі найперш вынікае з кантэксту, дзе асоба юбіляра адчувальна прысутнічае ў распрацоўцы блізкіх яго інтарэсам і яго духу тэм. У тым ліку і таго, што датычыць беларускай праблематыкі.

Да Беларусі Базыль Белаказовіч мае непасрэднае дачыненне. Ён нарадзіўся на Беласточчыне, у вёсцы Відове, што непадалёку ад Бельска-Падляшскага, выхоўваўся ў політэтнічным асяроддзі, добра ведае культуру, мову, гісторыю і побыт беларусаў. Жыццё, праўда, яго прафесійную скіраванасць павярнула ў іншы бок. У пачатку 1950-х гадоў пасля заканчэння сярэдняй школы яго, як вельмі здольнага вучня, адбіраюць для накіравання на вучобу ў Савецкі Саюз у Горкаўскі дзяржаўны універсітэт імя М.І.Лабачэўскага. Вучыўся на гісторыка-філалагічным факультэце, вызначаўся грамадскай актыўнасцю, узначальваў польскае зямляцтва. На апошніх курсах быў пераведзены на вучобу ў Ленінград, дзе пісаў дыпломную работу "Леў Талстой і польскі літаратурна-грамадскі рух" пад навуковым кіраўніцтвам вядомага знаўцы творчасці класіка прафесара Б.І.Бурсава. Такім чынам, параўнальна-гістарычнае, найперш руска-польскае літаратуразнаўства стала вызначальным для яго дзейнасці і на наступныя гады і прынесла яму славу і пашану. Бо гэта быў якраз той накірунак у навуцы, які ўладамі заахвочваўся. Аднак, трэба падкрэсліць, Базыль Белаказовіч прыстасаванцам ніколі не быў, дбайна і сумленна церабіў свой шлях наперад, асэнсоўваючы новыя, чыста навуковыя тэмы і праблемы. Вось як пра гэта напісала беларуская даследчыца Галіна Твярановіч ва ўжо згаданым уступным раздзеле ў артыкуле "Ангажаванасць кампаратывістыкай":

"Здаецца, няма буйнога славістычнага асяродка як у Польшчы, так і за яе межамі, дзе б не ведалі, не лічыліся з даследаваннямі прафесара Базыля Белаказовіча. Уражвае абсяг яго навуковых інтарэсаў: руская і беларуская літаратура, культуралогія, літаратурная кампаратывістыка, пагранічча культур, культурны цэнтр і яго перыферыя, рэгіяналізм і малыя айчыны, краіна нараджэння як культурны чыннік творчасці, праблема асіміляцыі і захавання ўласнай тоеснасці ў літаратурах пагранічча, ідэалы этнічнай ментальнасці, стэрэатыпы і маргіналіі..."

Беларускай тэматыцы ў творчасці Белаказовіча ў кнізе прысвечаны адмысловы артыкул Уладзімежа Стохеля — аўтара з Ольштына. Выяўляецца цікавая і, безумоўна, сімпатычная асаблівасць: амаль ад самага адкрыцця на Беласточчыне тыднёвіка "Ніва" Базыль Белаказовіч, нягледзячы на ростань з родным краем, становіцца актыўным аўтарам і друкуе тут дзесяткі артыкулаў самага рознага зместу, але прысвечаных беларускай праблематыцы. Тое самае можна сказаць пра выдадзеныя на Беласточчыне навуковыя зборнікі, часопіс "Тэрмапілы", а таксама ў асноўным польскамоўныя, але з беларускай арыентацыяй "Kontrasty" і "Czasopis". Апрача гэтага, беларуская тэматыка асэнсоўваецца ім і на старонках цэнтральнага агульнапольскага друку. Мяркую, надрукаванага дастаткова, каб выдаць адмысловы беларускі па тэматыцы і мове зборнік. Ды гэта так, да слова. Асаблівую ж увагу варта звярнуць на выдадзеную ў 1988 годзе ў Беластоку кнігу-даследаванне Б.Белаказовіча "Між Усходам і Захадам. З дзеяў фармавання беларускай нацыянальнай свядомасці". Дазволю сабе яшчэ раз працытаваць артыкул Галіны Твярановіч: "М.М.Косанавіч, рэцэнзуючы чарговую кнігу Базыля Белаказовіча (маецца на ўвазе "Паміж Усходам і Захадам". — Я.Л.), напрыканцы свайго разгляду ў бялградскай "Славістыцы" настойліва раіць калегам пазнаёміцца з гэтым выданнем, "бо яно ўтрымлівае цікавыя факты з беларускай гісторыі, дадзеныя аб выбітных асобах беларускай літаратуры, аб беларускіх патрыётах, людзях, чыёй жыццёвай задачай было абуджэнне беларускай нацыянальнай свядомасці ў сваіх земляках, што жылі ў шматэтнічным і шматканфесійным асяроддзі".

Між іншым, сербская рэцэнзентка асаблівую ўвагу звяртае на раздзел, прысвечаны Адаму Міцкевічу. На яе думку, гэты раздзел з'яўляецца для сербскага чытача найбольш займальным і нават сенсацыйным: "У кожнага з нас гэтае імя (Адам Міцкевіч. — Г.Т.) абуджае асацыяцыі пра польскую літаратуру, кожны ўспрымае Адама Міцкевіча як польскага паэта [...] Базылі Белаказовіч нас пераконвае, што беларускае паходжанне прозвішча неаспрэчнае, аб чым сведчыць і ягоная этымалогія". Так, абапіраючыся і на этымалогію прозвішча паэта, і на месца яго нараджэння, Базылі Белаказовіч пераканаўча даводзіць, што геній Адама Міцкевіча належыць і беларускай культуры, чым даследчык актыўна садзейнічае ўсталяванню навуковай аб'ектыўнасці". І, дадам ад сябе, падае, як паляк, у гэтым прыклад і беларускім навукоўцам, якім не заўсёды хапае смеласці прызнаць Міцкевіча хоць бы напалову "сваім".

Напрыканцы па некалькі слоў пра іншых аўтараў кнігі, не пра ўсіх, вядома, а пра беларускіх. Цікавае прачытанне "Проза Масея Сяднёва" ў кантэксце сусветных здабыткаў даў кіраўнік аб'яднання беларускіх пісьменнікаў у Польшчы "Белавежа" Ян Чыквін. Шмат трапных назіранняў у кантэксце польска-беларускіх літаратурных узаемаадносін ёсць у артыкуле Уладзіміра Казберука "Пераклічкі і рэмінісцэнцыі". На гэтай праблематыцы, што называецца, аўтар даўно зубы з'еў. Так, як і Ксенафонт Лецка, які выступае тут з артыкулам "Праблемы беларускага раманцтызму XIX стагоддзя ў кантэксце беларуска-польскага ўзаемадзеяння". Свежы па фактуры матэрыял Мікалая Хмяль-ніцкага "Адам Плуг і Беларусь". Пра "Радавое гняздо Здзяхоўскіх", якое адначасова з'яўляецца радавым гняздом і аўтара артыкула, гэта значыць, пра мястэчка Ракаў напісаў Вячаслаў Рагойша. Напісаў шчыра, узнёсла, пранікнёна, дасканала давёўшы, якім вялікім духоўным патэнцыялам валодалі ў мінулым нашы мястэчкі. Многія з іх страцілі свой духоўны набытак, чаго нельга сказаць пра Ракаў, дзе стараннямі таго ж Вячаслава Рагойшы выдаецца друкаваны орган "Ракаўскі шлях", існуе хатні, але з цікавымі экспанатамі музей Рагойшаў, не менш цікавы музей керамікі і мастацкая галерэя ў хаце Янушкевічаў, у якой і сёння мае майстэрню, жыве і працуе жывапісец Фелікс Янушкевіч. Не менш плённа праявіў сябе ў скульптуры яго брат Валерыян. А Казімір пайшоў дарогай фізіка-навукоўца. Ну а пра літаратурна-архівісцкі талент Язэпа Янушкевіча сведчаць яго кнігі, а таксама артыкул з інтрыгуючай назвай "Дынабург—Парыж—Лондан—Кукавячын, або Яшчэ адзін жыццяпіс змагарнага XIX стагоддзя" пра Алеся Рыпінскага, змешчаны ў гэтай кнізе. Вячаславу Рагойшу ёсць што сказаць пра блізкіх яму, належных да Ракава людзей — гэта і яго бацька, і жонка-філолаг Таццяна Кабржыцкая, і сыны Усевалад і Пятро, першы з якіх змясціў у кнізе цікавы матэрыял "Паэзія Алеся Гаруна на тле суседніх літаратур пачатку XX стагоддзя", а другі — "Украінскія кантэксты творчасці Сяргея Пясецкага", дарэчы, вельмі цікавага, пакуль што не адкрытага беларускаму чытачу аўтара, які пісаў на польскай мове, меў непасрэднае дачыненне да Ракава і Беларусі ўвогуле.

Вось такое мястэчка Ракаў, дзе праводзяцца таксама і навуковыя канферэнцыі, у якіх прымаў удзел і Базыль Белаказовіч. Мяркую, беларускі блок кнігі, а сюды яшчэ трэба дадаць надрукаваны па-польску артыкул Уладзіміра Мархеля "Міцкевіч і Пушкін — узаемапераклады" і маскоўскага аўтара Віктара Хорава "Польско-белорусское пограничье в творчестве Тадеуша Конвицкого", хоць і не такі абсяжны, як рускі і польскі, але побач з украінскім годна ўшаноўваюць даследчыка польска-руска-беларуска-ўкраінскага літаратурнага пабрацімства, якому ад шчырага сэрца хочацца пажадаць новых творчых поспехаў і доўгіх гадоў жыцця.



асоба ў бязмежжы часу

МАСТАКІ

УЛАДЗІМІР І РАСЦІСЛАЎ АКУШКІ

У.Акушка. «Дзяўчына ля снапа».

Хто цікавіцца мастацтвам Малдавіі, таму добра вядомыя імёны Уладзіміра і Расціслава Акушкаў, бацькі і сына. Калі я вырашыў даведацца пра мастакоў больш падрабязна і стаў знаёміцца з іх біяграфіяй, то, на маё здзіўленне, даведаўся: Уладзімір Акушка родам з Ашмян, што на Гродзеншчыне, нарадзіўся 7 лютага 1862 года ў сям'і павятовага чыноўніка. У час вучобы ў рэальным вучылішчы ў Вільні Уладзімір шмат маляваў і марыў стаць мастаком. У 1880 годзе пасля заканчэння вучылішча вырашыў паступаць у Пецярбург у Акадэмію мастацтваў. Бацька быў супраць рашэння сына, але Уладзімір парваў з сям'ёй, пазычыў грошай і паехаў у Пецярбург, дзе паступіў у клас малюнка вядомага мастака-педагога П.Чысцякова.

У 1896 годзе У.Акушка атрымаў у акадэміі пасведчанне на права выкладання малюнка ў сярэдняй школе. На наступны год па выкліку Гарадской управы і дырэкцыі народных вучылішчаў паехаў у Кішынёў. Такое рашэнне ім было прынята з мэтай мець пастаянны заработак і працаваць самастойна. У Бесарабіі пачаўся галоўны перыяд жыцця мастака-педагога.

У школу малюнка, якую ён узначальваў, запрашаюцца педагогі малюнка, жывапісу і чарчэння, ствараюцца спрыяльныя ўмовы для выхавання мастакоў. На заняткі прыходзяць вучні з павятовага вучылішча і гарадскіх школ. У 1901 годзе школа пераходзіць у новы будынак. Уводзіцца малюнак з аголенай натуры, адкрываецца школьны вучэбна-метадычны музей. У фонды музея з Пецярбурга прысылаюць працы студэнтаў Акадэміі мастацтваў. Асноўныя фонды складаюць працы навучэнцаў школы. Заснавана спецыяльная бібліятэка па сучасным мастацтве, выпісваюцца часопісы з-за мяжы. У школе займаюцца дзеці і дарослыя. Бедных вучняў У.Акушка вызваляе ад платы за навучанне. З гэтай установы шмат навучэнцаў працягвалі вучобу ў Парыжы, Санкт-Пецярбургу і Маскве. Многія з іх сталі вядомымі мастакамі: П.Шылінгоўскі — прафесар Усерасійскай акадэміі мастацтваў; А.Бразер — беларускі скульптар, жывапісец і графік, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР; В.Несцераў — мастак, доўгі час працаваў старшынёй Саюза мастакоў Адэсы (Украіна); А.Пламадзяла — вядомы бесарабскі скульптар, выхаванец Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і архітэктуры.

Шмат часу мастак аддаваў гуртку аматараў жывапісу, які ў 1903 годзе быў афіцыйна прызнаны і атрымаў назву "Бесарабскае грамадства выяўленчых мастацтваў", якім з 1903 па 1911 год было арганізавана ў Кішынёве 6 мастацкіх выстаў. У іх прынялі ўдзел мастакі з Расіі і Украіны: І.Рэпін, А.Галавін, І.Бродскі, К.Багаеўскі, К.Кастандзі, Багданаўбельскі, М.Піманенка. Грамада перасоўнікаў і Паўднёва-руская грамада сведчаць, што ў пачатку XX стагоддзя на мастацкае жыццё ў Кішынёве ўплывала мастацкая школа, якую ўзначальваў Акушка.

Творчы шлях мастака не такі значны, як педагагічная дзейнасць. Часу для творчасці не заставалася. Ён мог працаваць толькі ў час канікулаў і свят. Збіраў эцюдны матэрыял, каб пісаць карціны "Прагулка", "Чаканне". Летам мастак выязджаў на Днестр, дзе былі напісаны эцюды "Днестр" і "Плаціна". Яго цікавіла жыццё простых сялян. Іх праца — матывы пейзажаў з фігурамі: "На вадапоі", "Валы на дарозе", "Вяртанне з поля". У 1904 годзе мастак у складзе рускай дэлегацыі едзе ў Жэневу на Міжнародны з'езд настаўнікаў, дзе вырашаліся пытанні методыкі выкладання малюнка і эстэтычнага выхавання. У час паездкі ў Швейцарыю У.Акушка быў зачараваны прыгажосцю і веліччу гор. "Горы", "Горы і возера" — самыя цікавыя яго творы. Трапяткі пэндзаль, якім напісаны карціны, настрой, адчуванне асяроддзя можна параўнаць з працамі імпрэсіяністаў.

Будучы цяжкахворым, мастак складае праграму-праект рэарганізацыі школы малявання ў мастацкае вучылішча. У снежні 1918 года Кішынёўская гарадская камісія выносіць рашэнне, каб школа атрымала статус мастацкага вучылішча. Такім чынам, У.Акушка з'яўляецца заснавальнікам мастацкага вучылішча ў Бесарабіі, якое было адзінай установай да 80-х гадоў XX стагоддзя, што рыхтавала прафесійных мастакоў.

У 1919 годзе мастак памірае. Гэта час значных палітычных змен. Каралеўская Румынія захапіла тэрыторыю Бесарабіі. Нацыянальныя колы робяць усё, каб перашкодзіць уплыву школы рускага мастацтва на бесарабскіх мастакоў і ролю школы малюнка ў развіцці мастацкага жыцця ў Кішынёве. Былі выкрадзены творы У.Акушкі, знішчаны яго бюст, выкананы скульптарам Патлажанам.

21 невялікі па памерах эцюд, які падарыў сын У.Акушкі, зараз знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Малдовы — усё, што засталося ад спадчыны мастака. Асноўныя творы загінулі ў час другой сусветнай вайны.

Сын У.Акушкі Расціслаў — вядомы мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў МССР, доўгі час выкладаў у мастацкім вучылішчы. Мастакі старэйшага пакалення ўспамінаюць пра яго як пра чалавека высокай культуры.

Р.Акушка нарадзіўся ў 1897 годзе. Мастацкую адукацыю атрымаў у Акадэміі мастацтваў у Ясах (Румынія).

Росквіт творчасці мастака прыходзіцца на 50-я — пачатак 60-х гадоў. Яго жывапісным творам характэрныя, як і большасці агульнапрынятых прац таго часу, вялікія памеры палатна, абагульненыя каляровыя планы. "Дубасарская ГЭС" (1959) і "Асфальт" (1961) увайшлі ў залаты фонд мастацкага музея. Але самымі цікавымі з'яўляюцца працы, напісаныя з натуры: "Адэса. Порт", "Гурзуф", "Вуліца Кішынёва". За гэты час з'явілася вялікая колькасць партрэтаў тых, каго мастак добра ведаў, з кім сябраваў: "Кампазітар Кока", "Мастак М.Грэку", цікавыя аўтапартрэты.

Прыведзеныя звесткі ў асноўным узяты з кнігі К.Радніна і Р.Акушкі "Владимир Фульгентьевич Окушко — педагог и художник", якая выйшла ў Кішынёве ў 1962 годзе да стагоддзя мастака. На адкрыцці выставы бацькі і сына, што адбылася ў Нацыянальным мастацкім музеі, пасол Беларусі ў Малдове В.Саковіч паабяцаў, што прыложыць намаганні, каб гэта кніга была выдадзена ў Беларусі, а імя Уладзіміра Акушкі стала вядомым на радзіме ўсім, хто цікавіцца нашай спадчынай.

Пасля смерці Расціслава Акушкі (1966) яго сын Уладзімір, названы ў гонар дзеда, перадаў у Нацыянальны гістарычны музей Малдовы фотаздымкі з архіва сям'і, палітру і пэндзлі мастака, шэраг дакументаў, якія можна было ўбачыць на адкрыцці выставы.

Мастакі па прызванні Уладзімір і Расціслаў Акушкі пакінулі добры след у мастацкіх творах і вучнях.

Вячаслаў ІГНАЦЕНКА.

Р.Акушка. «Асфальт». 1961 год.

У. Акушка. «На ворыве». 1901 год.

г. Кішынёў.

зваротная сувязь

ЛАТВІЯ

Цёплым і сонечным быў вечар на вуліцы і такі ж — у Белай зале Даўгаўпілскага раённага дома культуры "Varpa". Тут прайшоў аўтарскі вечар Станіслава Валодзькі, дзе прэзентаваліся яго зборнікі вершаў "Памяці гаючая трава", "Чудесный котик" і "Калыханкі і пацешкі для Антошкі і Алежкі".

ЦЁПЛЫ ВЕЧАР

Песні і рамансы на вершы С.Валодзькі кампазітараў А.Снятковай, А.Рудзя, Г.Галіцкага, М.Калныні, М.Яцкова выконвалі дзіцячы ансамбль 1-й пачатковай школы, беларускі ансамбль "Купалінка" г.Даўгаўпілса, салісты С.Піманаў, М.Калныні, П.Прозар, В.Славінская, Н.Рахманава і В.Шылава. Сыны С.Валодзькі Алег і Антон прачыталі вершы бацькі. З прывітальнымі словамі да віноўніка ўрачыстасці звярнуліся выконваючы абавязкі генеральнага консула Генеральнага консульства Беларусі ў Даўгаўпілсе Аляксандр Концкі, дэпутат Даўгаўпілскай гарадской думы Ірэна Фолкмане, прафесары Даўгаўпілскага універсітэта Эдуард Мекш і Людміла Цімошчанка, дырэктар Краслаўскага дома культуры Язэп Дабкевіч. Хлеб-соль на ручніку паднесла паэту салістка Віцебскай філармоніі Валянціна Шылава. Паэты Павел Макаленкін і Яўген Голубеў прачыталі свае вершы, прысвечаныя калегу па пяру. Лірычна і эмацыянальна вяла вечар Яўгенія Гуляева. Гучаў тут і "Паланез Агінскага" ў выкананні скрыпача Мікалая Слюсара.

Садзейнічанне ў правядзенні вечарыны аказалі вядомыя даўгаўпілскія фірмы і Даўгаўпілская гарадская дума.

Стас ГОРЫН.

НА ЗДЫМКУ: С.ВАЛОДЗЬКУ віншуюць консул А.Концкі і сябар беларускага таварыства "Уздым" А.Бучэль.

дайджэст

"ЗАПРАШАЮ СПАДАРСТВА НА ДРЫЗІНУ!"

НЕПРЫЧАСАНЫЯ ДУМКІ ПРА ЗАСЛУЖАНЫ АДПАЧЫНАК ПАД БАЙКАЛЬСКІ ВЕТРЫК

Байкал — рабочы пасёлак на беразе, цёзка вядомага возера. Дзесьці ўбаку засталіся аўтадарогі, паводдаль прайшоў БАМ. Тут жа — некрануты лес, цудоўнае возера, цішыня і хараство. У спадчыну пасёлку засталася толькі вузкакалейка, ды і тое — тупік. Але па пятніцах, пыхкаючы саляркай, цеплавоз прыцягне сюды некалькі турыстычных вагонаў ды пересоўны магазін — вось і ўсё жыццё!.. Заехаць у гэту глухамань па кішэні не кожнаму. Едзе сюды турыст багаты — з усяго свету.

У шматмоўным турыстычным натоўпе вуха разанула беларуская гамонка. Маленькі мужычок у кірзавых ботах, пераходзячы з беларускай на нямецкую, а то і на англійскую, нешта тлумачыў гасцям Расіі. Тым, хто не разумеў, тлумачыў на пальцах. Дзед Коля — экскурсавод, настырны канкурэнт заезджым паненкам, якія размаўлялі на добрай англійскай пра "слаўнае мора". Ён жа — тутэйшы, можа расказаць і паказаць вандроўнаму люду ўсе прыгожыя байкальскія мясціны.

Мікалай Ясюкевіч, мой новы знаёмы, маладым паехаў у Сібір на заработкі. І не заўважыў, як на байкальскім беразе прайшло яго жыццё. Закахаўся ў гэты край. Цяпер дзеду Колю далёка за семдзесят. На пенсію спадзяванні маленькія, вось ён і вырашыў арганізаваць уласны бізнес. На спісаную ручную дрызіну прыстасаваў спачатку матор ад бензапілы (а цяпер, калі справы пайшлі, знайшоў рухавік больш магутны), прычапіў два, так бы мовіць, вагоны. Чартарныя рэйсы сталі рэгулярнымі. Цяпер ужо экскурсаводы ішлі да Мікалая Іванавіча ўзгадняць тэрміны заездаў груп з яго магчымасцямі. Без гэтай няхітрай машынкі пешшу па Байкалу шмат не находзіш — адлегласці ўсё ж вялікія.

Дзед Коля з гонарам выкаціў з гаража сваё дзецішча. Іншаземцы ў захапленні. Зашчоўкалі затворы фотаапаратаў. Не кожны музей Еўропы можа пахваліцца такім экспанатам. Падцягнуўшы счапленне і праверыўшы тармазы, вадзіцель выступае з прамовай:

— Возера Байкал па плошчы перавышае Бельгію і крыху саступае Швейцарыі. — Дзед Коля шматзначна абводзіць натоўп поглядам. Група якраз з Бельгіі і Швейцарыі. Параўнанні выклікаюць у іншаземцаў незабыўнае ўражанне.

Рассаджваючы гасцей зручней, стары збірае плату за праезд — рэйс камерцыйны, цэлых дзесяць рублёў з чалавека. Бельгійцы з разуменнем усміхаюцца: бізнес ёсць бізнес.

— Наступнай групе перадайце: білет будзе каштаваць 12 рублёў, — нібы просячы прабачэння, паведамляе Мікалай Іванавіч, — бензін падаражаў. Уселіся? Тады паехалі!

Едуць госці Байкала і ніяк не зразумеюць: возера — у тысячу разоў прыгажэйшае за Жэнеўскае, а па берагах ні віл, ні аўтабанаў. Толькі вузкакалейка, якая вядзе ў тупік, і дзед Коля на дрызіне...

Генадзь СМІРНОЎ, "ДВ".

гасцёўня

ЮРЫЙ ВЫДРОНАК І ГУРТ "UR'IA"

Да творчасці гурта "UR'IA" крытыкі ўжываюць розныя азначэнні. Іх называюць занадта таямнічай і замкнёнай у сабе камандай і, у той жа час, пра іх кажуць як пра самы паспяховы ў камерцыйным сэнсе фолк-мадэрн праект. Гурт "UR'IA" заўсёды ўспамінаюць, калі размова ідзе пра арыгінальнасць ці каларытнасць музыкі, якая выконваецца... Усе гэтыя якасці творчасці гурта неверагодным чынам зліліся ў тую музычную з'яву, якую завуць гуртом Юрыя "Франца" Выдронка.

І хоць у тым, што гаворыцца пра гэты музычны калектыў, часта бывае шмат выдумкі, музыкі не спяшаюцца абвяргаць чуткі, а, наадварот, імкнуцца культываваць вакол сябе арэол таямнічасці ды злітарнасці. Гэты арэол зрабіўся яшчэ больш яркім, калі выйшаў першы альбом гурта — "Вэсначуха", які стаў сапраўднай сенсацыяй на музычным рынку Беларусі. Мультымедыйнае начынне, афармленне і апрацоўкі "Вэсначухі" зрабілі дыск і яго аўтараў адной с заўважных музычных з'яў на кантыненце. І гэта не рэкламны пасаж: як адна з лепшых беларускіх каманд, "UR'IA" стала прэзентаваць беларускую культуру па ўсёй Еўропе. І робіць гэта настолькі паспяхова, што за замежнымі паездкамі, бывае, не хапае часу на канцэрты для беларускіх прыхільнікаў.

І тым не менш, спраў у музыкаў "UR'IA" ў Беларусі хапае. Яны не парываюць сваіх сувязей з Бацькаўшчынай: шукаюць новых музычных уражанняў падчас сваіх экспедыцыйных вандровак, адпрацоўваюць новы студыйны матэрыял, удзельнічаюць у буйных музычных мерапрыемствах...

Акрамя гэтага, не прапускаюць магчымасці сустрэцца і пагутарыць з журналістамі, распавесці пра свае гастрольныя паездкі і планы. Вось і сёння Юрый Выдронак пасля такога падарожжа дзеліцца сваімі ўражаннямі з нашым карэспандэнтам.

— Апошняя наша замежная паездка адбылася не так даўно — на джазавы фестываль у Польшчу. Скажу шчыра, калі нас запрасілі на гэты фэст, які адбываўся ў Варшаве, то мы былі вельмі здзіўлены выбарам арганізатараў. Бо фестываль быў заяўлены як агляд джазавай і эксперыментальнай музыкі. Ды і музыканты на фестываль у Варшаву з'ехаліся самага вышэйшага ўзроўню. Таму мы нават спалохаліся, бо гэта — не наша музычная сфера. А тут яшчэ нас паставілі на завяршэнне канцэрта побач з джазавымі зоркамі. Як мы са сваім фолк-рокам, замешаным на гучанні архаічных беларускіх інструментаў і эксперыментах з андэрграўндам, будзем упісвацца ў агульную канцэртную канву? Гэтае пытанне не давала нам спакою доўгі час...Але калі на гэтым фестывальным канцэрце гурт "UR'IA" выклікалі тройчы на "біс", калі знакамітыя еўрапейскія музыканты падыходзілі да нас і дзякавалі за знаёмства з беларускай музыкай, запрашалі да сумесных запісаў, то мы зразумелі: наша творчасць вельмі арганічна падыходзіла да канцэпцыі гэтага джазавага фестывалю.

Нас хутка зноў чакаюць гастролі ў Польшчы. Вядуцца перамовы пра канцэрты ў Літве, Фінляндыі і Швецыі. Справы ідуць да таго, што да канца года гэтыя паездкі ажыццявяцца.

На жаль, у Беларусі канцэртаў будзе няшмат. Вось атрымалі запрашэнне на "Славянскі базар", на якім мы пасля ваганняў вырашылі выступаць. Проста ўмовы, якія там ствараюцца (трэба спяваць і граць пад фанаграму) нас не вельмі задавальняюць. Але мы будзем выступаць на "Славянскім базары", каб і ў Беларусі ведалі, што ёсць такі гурт — "UR'IA".

Нашы планы на гэты год, акрамя іншага, звязаны з правядзеннем другога нацыянальнага фэсту фолк-мадэрна "Таўкачыкі", ажыццяўленне якога ўвесь час адкладвалася па розных прычынах. Добра, што зараз нечакана атрымалі падтрымку нашых планаў з-за мяжы і фэст "Таўкачыкі" будзе адроджаны. Гэтаму праекту ўзяліся дапамагаць прадзюсерская фірма "Этнафера" з Польшчы і фірма грамзапісу "Aria Records F.A." Адна частка фэсту "Таўкачыкі" адбудзецца ў Польшчы, другая — у Мінску. Гэта значыць, што фэст ператворыцца ў міжнародны і будзе мігрыраваць з адной краіны ў іншую. Шмат людзей да нас звярталася з просьбай аб працягу гэтага фэсту. І я лічу, што нельга падманваць іх чаканні. Таму ўсе сілы будуць пакладзены дзеля таго, каб "Таўкачыкі" зноў парадавалі слухачоў сваімі неверагоднымі рытмамі і мелодыямі ў Польшчы, і тут, у Беларусі.

У рамках супрацоўніцтва з польскай фірмай "Этнасфера" мы будзем працягваць папулярызацыю беларускай музыкі, звязанай з архаічным фальклорам. Напрыклад, разам з гуртамі "Акруга вольнага мастацтва", "Палац", дуэтам "Аляксандра і Канстанцін" паедзем на фестываль у польскі горад Скірневіцэ. Мы маем права прадстаўляць беларускіх музыкаў і іх інтарэсы на гэтым аўтарытэтным фестывалі этнічнай музыкі. Гэтаму спрыяла тое, што беларуская музыка, заснаваная на архаічным фальклоры, становіцца папулярнай у Польшчы і таму, што наш гурт зрабіў некалькі ўдалых канцэртаў на элітных сцэнах суседняй краіны. І людзі пачалі цікавіцца музыкай і культурай Беларусі. Раней такіх шанцаў не было!

— Думаю, што прыхільнікі гурта "UR'IA" ўжо зачакаліся вашага новага альбома. Якімі музычна-стылістычнымі асаблівасцямі ён будзе адрозніваца ад першага дыска "Вэсначуха", ці будзе яго суправаджаць такое ж выдатнае мультымедыйнае начынне, якое ёсць на першым дыску?

— Па-першае, новы альбом будзе адрознівацца больш якасным гукам, мінімальным выкарыстаннем электронных клавішных інструментаў: сінтэзатараў і сэмпляраў. Акрамя гэтага, мы плануем выкарыстоўваць гучанне "жывой" віяланчэлі, а таксама архаічныя беларускія інструменты — ліру, жалейку і, зразумела, дуду, на якой цяпер, акрамя Віктара Кульпіна, грае і наш гітарыст Юрый Задзіран. Спадзяёмся таксама, што новы альбом будзе больш рокавым, які адпавядае дынамічнай і псіхаэмацыянальнай атмасферы хіпі пачатку 70-х гадоў.

Музычны матэрыял для гэтага дыска (назву музыкі трымаюць у сакрэце, каб не сурочыць.—**А.М.**) ужо падрыхтаваны, зроблены эксперыментальныя запісы. Цяпер справа за запісам у якаснай студыі. "Жывыя" акустычныя інструменты і вакальныя партыі збіраемся запісаць у звычайных сялянскіх хатах ці ў музеі ў Строчыцы — для стварэння неабходнай акустычнай атмасферы. Астатнія інструменты — у нашай студыі, якую мы ствараем з дапамогай спонсараў з фірмы "Ізовер".

Традыцыі "Вэсначухі" будуць працягвацца ў афармленні новага дыска. Мы зноў будзем звяртацца да мастацкіх твораў Язэпа Драздовіча, а мультымедыя на дыску будзе зроблена ў тэхналогіі 3D-анімацыі: у гэтым фільме вобразы мастацкіх палотнаў Драздовіча мы хочам спалучыць з новымі віртуальнымі аб'ектамі. Думаю, дзядзька Язэп на мяне за такія навацыі не пакрыўдзіўся б!

— "Вэсначуху" ў Беларусі выдала фірма "Каўчэг". Гэтае супрацоўніцтва будзе працягвацца ці вы мяркуеце выдаць новы дыск зноў жа за мяжой?

— Гэты альбом будзе выдаваць польская фірма "Этнасфера". Калі ў кіраўніцтва "Каўчэга" будзе жаданне выдаць яго для беларускіх слухачоў, то мы абавязкова падтрымаем гэтую ініцыятыву. Але будзем глядзець на бізнесавую сітуацыю з альбомам, бо мы не заўсёды маем фінансавую магчымасць рабіць спонсарскі варыянт дыска для Беларусі...Калі ж з'явяцца грошы, мы выдадзім другі дыск гурта "UR'IA" спецыяльна для беларусаў.

Дыск "Вэсначуха" ж будзе перавыдадзены ў Польшчы ў змененым выглядзе. Але сімволіка, накіраванасць на творчасць Драздовіча, праграма альбома абавязкова захаваюцца. Магчыма, крышачку памяняецца дызайн вокладкі.

— Гурт "UR'IA" ўвесь час лічыўся лабараторыяй для маладых выканаўцаў. Гэтаму спрыяла тое, што яго база знаходзілася ў Беларускім універсітэце культуры. Але, угэўнены, вашым прыхільнікам будзе цікава даведацца, якія музыканты цяпер складаюць касцяк гурта...

— Наш склад, сапраўды, увесь час быў у руху, але аснова заставалася нязменнай: акрамя мяне, у гурце пастаянна працуюць Юрый Задзіран (гітара, сітар, дуда), Андрэй Сівец (ударныя). Цяпер у нас на бас-гітары грае малады, таленавіты Слава Сяргеенка. Астатніх удзельнікаў мы запрашаем, у тым ліку і студэнтаў БУКа. Пастаянна шукаем маладыя таленты з мэтай стварэння прафесійнай каманды ў духу 70-х гадоў, з імкненнем да фальклорных крыніц і, у той жа час неабыякавых да рок-н-рольных традыцый той эпохі.

— Ці плануеце вы ў бліжэйшы час традыцыйныя для гурта "UR'IA" экспедыцыі па Беларусі з мэтай запісу старажытнага беларускага фальклору ?

— Экспедыцыі ў розныя раёны Беларусі абавязкова будуць. Паедзем па вёсках, якія знаходзяцца ў лясах. Нам цікава, які там захаваўся фальклор, падругое, мы будзем прыглядацца да сялянскіх хат, у якіх можна было б запісаць акустычныя інструменты ды вакал для новага альбома.

Акрамя гэтых спраў, мы плануем сумесна з польскім кінарэжысёрам Маеўскім зняць мастацка-дакументальную стужку пра наш гурт. Мы ўжо пачалі гэта рабіць са здымак у лодзенскім клубе "Форум-фабрыкум" і працягнем гэтую працу ўжо ў вёсках Беларусі. Таму новая экспедыцыя будзе на "джыпах", з вельмі добрымі здымачнымі камерамі. Адным словам, сапраўды прафесійна падрыхтаванай...

Калі ў свой час гурт "Палац" пачалі пакідаць для рэалізацыі сваіх праектаў таленавітыя музыканты, то слухачы і крытыкі ўспрынялі гэты факт з трывогай. З трывогай глядзелі і на Юрыя Выдронка, які захапіўся сольным праектам. Але такая вось натура гэтага музыканта — увесь час справамі даводзіць тое, што ў талента не павінна быць творчых абмежаванняў. Таму выхад з "Палаца" і стварэнне гурта "UR'IA" пайшло на карысць усім.

Гутарыў Анатоль МЯЛЬГУЙ.

рыбалка на нёмане

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

крыжаслоў ад аляксея шаўчэнкі

ПЕРАКЛАДЗІЦЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 5. Мшанка. 6. Швея. 10. Дымка. 11. Трубка. 12. Стройка. 13. Пар (с/х.). 15. Плен. 18. Пахарь. 19. Корь. 20. Дюжина. 22. Сумка. 25. Изнеможение. 27. Деревянное масло. 29. Рюмка. 31. Широкая межа. 32. Отечество. 33. Скот (крупный рогатый). 34. Проволочка.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 1. Зарево. 2. Дубление. 3. Изразец. 4. Жировая капля на воде. 3. Утенок. 8. Зерно, хлеб. 9. Висок. 14. Родина. 15. Благодарность. 16. Стража. 17. Читатель. 21. Метель. 23. Утро. 24. Пион. 26. Гончая собака. 28. Светец. 29. Ком. 30. Колышек.



«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя, тэл./факс), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 082 экз. Заказ 1903. Падпісана да друку 19. 7. 2002 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку»
(220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).